РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 КРАСАВІКА 2025 г. СУБОТА № 72 (30460)



НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕМ 5



ФУТБОЛ... НА КАЛЯСКАХ 12

# «НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА СУСВЕТНЫЯ ПЕРЫПЕТЫІ, НАШЫ КРАІНЫ ЗАСТАЛІСЯ ДОБРЫМІ СЯБРАМІ І НАДЗЕЙНЫМІ ПАРТНЁРАМІ»

**У чым асаблівасць візіту дэлегацыі Пакістана ў Беларусь і як гэта ўплывае на далейшае супрацоўніцтва**

«Закрытых тэм, як і з іншымі краінамі, у нас з Пакістанам няма. Мы гатовы супрацоўнічаць з вамі па ўсіх кірунках, якія вас цікавяць, пачынаючы з сельскай гаспадаркі і заканчваючы ваенна-прамысловым комплексам. Для таго каб задаволіць патрэбы насельніцтва Пакістана, вялікай колькасці насельніцтва (гэта пятая ў свеце краіна па колькасці насельніцтва), у Беларусі ёсць усё», — адзначаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас перагавораў з прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам у лістападзе 2024 года, калі беларускі лідар з афіцыйным візітам наведваў гэту краіну. Тады бакі дамовіліся, што палітычныя адносіны, якія бліскуча развіваюцца ўжо 30 гадоў, трэба манетызаваць, паглыбляць гандлёва-эканамічны кірунак. У працяг дамоўленасцяў і для канкрэтных спраў у Мінск з афіцыйным візітам прыляцеў прэм'ер-міністр Пакістана Шахбаз Шарыф.



Фота БелТА.

Першая сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам прайшла ўвечары напярэдадні афіцыйных перагавораў ў цёплай, сяброўскай, дамашняй абстаноўцы. У госці да беларускага лідара Шахбаз Шарыф прыехаў са сваёй сям'ёй. Разам з ім таксама былі яго брат, прэзідэнт Пакістанскай мусульманскай лігі, былы Прэм'ер-міністр Пакістана Наваз Шарыф і галоўны міністр (губернатар) правінцыі Пенджаб Мар'ям Шарыф. «Гэта першая краіна, якую мы наведваем удвух», — адзначыў Наваз Шарыф. «Наваз, ты сапраўдны сябар!» — падзякаваў кіраўнік дзяржавы за цёплыя словы.

У афіцыйнай, але таксама сяброўскай і цёплай абстаноўцы перагаворы Аляксандра Лукашэнкі і Шахбаза Шарыфа прайшлі ў пятніцу ў Палацы Незалежнасці. Сустрэча пачалася з традыцыйнай для такіх візітаў афіцыйнай цырымоніі з удзелам роты ганаровай варты. Аляксандр Лукашэнка асабіста сустрэў высокага госця. Пасля цырыманіяльных працэдур лідары краін пачалі перагаворы, якія праходзілі не для пратакола, а для канкрэтных дамоўленасцяў.

## «МЫ НЕ МАЕМ ПРАВА НЕ РЭАЛІЗАВАЦЬ НАШЫ ДАМОЎЛЕНАСЦІ»

Найперш пагаварылі ў вузкім складзе. Аляксандр Лукашэнка ўзгадаў, што шмат гадоў таму Шахбаз Шарыф са сваім бацькам прыязджаў у Мінск. «Таму для цябе, спадзяюся, гэты горад стаў родным, як і наша Беларусь», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што напярэдадні падчас нефармальнай дамашняй сустрэчы, якая працягвалася амаль тры гадзіны, яны з Шахбазам Шарыфам абмеркавалі шэраг пытанняў, якія датычыліся міжнароднай сітуацыі і двухбаковага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў яго з Шахбазам Шарыфам склаліся добрыя, нават сямейныя адносіны. «Мы заўсёды будзем падтрымліваць такі ўзровень адносін. І спадзяюся, што пасля гэтага візіту, я проста перакананы, мы не маем права на тое, каб не рэалізаваць нашы дамоўленасці», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён заўважыў, што ў складзе дэлегацыі Пакістана ў Беларусь прыехала шмат бізнесменаў, якія зацікаўлены ў наладжванні канкрэтных адносін па канкрэтных кірунках з беларускім бокам.

**«Вы ведаеце, у нас машынабудаўнічая краіна, развітая сельская гаспадарка. Я вельмі добра ведаю, што трэба Пакістану. Вы таксама добра ведаеце, што патрэбна Беларусі ад Пакістана. Думаю, што ў працэсе гэтага візіту члены ўрада і кіраўнікі буйных кампаній дамовяцца аб перспектывах супрацоўніцтва», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Шахбаз Шарыф падзякаваў беларускаму лідару за цёплы, сямейны прыём, гасціннасць напярэдадні афіцыйных перагавораў. Асобна ён адзначыў смак беларускіх страў, якімі пакістанскіх гасцей частавалі. «Са свайго боку я пастараюся зрабіць усё, каб сяброўства паміж намі і нашымі краінамі станавілася мацнейшым», — заўважыў Прэм'ер-міністр Пакістана. Ён расказаў, што ўпершыню наведаў Мінск шмат гадоў таму і прызнаўся, што ўспаміны аб паездцы ў Беларусь засталіся ў памяці і да сённяшніх дзён. «Мы наведвалі сталеліцейны цэх. І ўжо тады я падумаў, што ваша краіна — высокаразвітая. І ўчора, калі ехаў па Мінску на машыне, я бачыў выдатныя будынкі, дзівіўся, якой цудоўнай стала ваша краіна, у тым ліку пад вашым мудрым кіраўніцтвам», — падзяліўся Прэм'ер-міністр Пакістана. Асабліва ён вылучыў выключную чысціню мінскіх вуліц. «І я хацеў бы аддаць належнае вашаму жаданню і далей весці да росквіту вашу цудоўную, вялікую нацыю», — сказаў Шахбаз Шарыф. Ён выказаў спадзяванне, што ў выніку добрыя адносіны Беларусі і Пакістана выльюцца ва ўзаемныя інвестыцыі. «Беларусь вельмі важная для нас з пункту гледжання сельскай гаспадаркі. Мы ведаем аб беларускіх трактарах. Мы ведаем, якую вялікую дапамогу могуць аказаць беларусы ў развіцці сельскай гаспадаркі нашай краіны», — адзначыў Прэм'ер-міністр Пакістана. Ён запрасіў беларускіх спецыялістаў з розных галін прыехаць у Пакістан і дапамагчы лакалізаваць вытворчасць, наладзіць абслугоўванне беларускай тэхнікі, каб рухацца далей.

## «МЫ ЗРОБІМ УСЁ, КАБ ВЫ НЕ ПАШКАДАВАЛІ АБ ГЭТЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ»

Перагаворы Аляксандра Лукашэнкі і Шахбаза Шарыфа працягнуліся ў шырокім складзе з удзелам членаў дэлегацый, у якія ўвайшлі міністры і службовыя асобы з двух бакоў.

«Дзякую Вам, спадар Прэм'ер-міністр, за тое, што прынялі маё запрашэнне і прыехалі ў гасцінную Беларусь. Шкада, што не зімой, як мы планавалі першапачаткова. Але з іншага боку, будзе стымул прыехаць да нас зноў, каб убачыць прыгажосць заснежаных беларускіх лясоў», — адзначыў беларускі лідар. Ён назваў сімвалічным тое, што беларускі і пакістанскі бакі не змяняюць традыцыям, і абмяняліся візітамі вельмі аператыўна, як гэта было дзесяць гадоў таму з Навазам Шарыфам, якога Аляксандр Лукашэнка называе сваім сябрам. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў 2015-м адбыліся першыя візіты на вышэйшым узроўні ў Ісламабад і Мінск. Тады былі падпісаныя стратэгічныя для адносін дзвюх краін палітычныя дакументы — Ісламабадская дэкларацыя беларуска-пакістанскага партнёрства і Дагавор аб сяброўстве і супрацоўніцтве.

**«Ствaральны дух гэтых дакументаў прайшоў выпрабаванне часам. Нягледзячы на сусветныя пэрыпетыі і выклікі бяспекі, нашы краіны засталіся добрымі сябрамі і надзейнымі партнёрамі, — заўважыў Прэзідэнт. — Падыходы Беларусі і Пакістана да ключавых пытанняў глабальнай павесткі супадаюць або падобныя».**

СТАР. 2



# АГУЛЬНАЯ ПРАЦА ДЛЯ БУДУЧЫХ ПАКАЛЕННЯЎ

**Сёння ў краіне праходзіць рэспубліканскі суботнік**

**У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў суботнік можна праводзіць на рабочых месцах, а таксама папрацаваць на азеляненні, добраўпарадкаванні і прывядзенні ў належны стан аб'ектаў і тэрыторый населеных пунктаў. Акрамя таго, прадстаўнікі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый сёння заняты на добраўпарадкаванні знакавых аб'ектаў, гісторыка-культурных каштоўнасцяў, мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы, пахаванняў воінаў і партызан часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

**Грашовыя сродкі, заробленыя ў дзень правядзення суботніка, у тым ліку на працоўных месцах, (парадак іх пералічэння рэгулюецца пастановай Міністэрства фінансаў) пойдуць на будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі. У 80-годдзе Вялікай Перамогі гэта даніна памяці тым, хто абараніў нашу краіну ад знішчэння, і захаванне гістарычнай памяці для нашчадкаў.**

З НАГОДЫ

# КОСМАС — НАШ!

Другі год наша краіна сустракае Дзень касманаўтыкі ў статусе касмічнай дзяржавы. Касмічная галіна, якая знаходзіцца пад пільным патранажам Прэзідэнта мае для рэспублікі стратэгічнае значэнне. Сапраўды, космас — гэта будучыня, прастора, асваенне якой дае штуршок развіццю літаральна ўсіх сфер эканомікі і не толькі.

У віншаванні суайчыннікаў з Днём касманаўтыкі кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі паспяхова рэалізуецца шэраг касмічных праектаў: ствараюцца новыя спадарожнікі, самае сучаснае абсталяванне, ідзе падрыхтоўка ўласных кадраў, што пацвярджае імідж Беларусі як высокатэхналагічнай краіны. Сёння Беларусь удзельнічае ў шэрагу сумесных з Расіяй касмічных праграм, у планах — пашырэнне беларускага складніка ў іх. Гэта і месяцавая праграма, і работа над Расійскай арбітальнай станцыяй, якая стане базай для расійскіх касманаўтаў пасля спынення дзеяння МКС.



Здзейснены ў мінулым годзе Марынай Васілеўскай палёт стаў не проста падзеяй — гэта сапраўдны доказ таго, што краіна ідзе правільным шляхам, нягледзячы на перашкоды. Разам з тым гэта толькі адна з прыступак, адна з вяршынь. Наперадзе новыя дасягненні і напружаная, плённая праца, далейшае развіццё айчыннай касманаўтыкі.

Аб гэтым і іншых цікавых фактах аб касмічнай галіне чытайце ў матэрыялах нашых карэспандэнтаў.

СТАР. 4

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — ВЕТЭРАНАМ

**Якую дапамогу ім акажуць напярэдадні 9 мая?**

Напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі ў Беларусі ўдзяляецца асаблівая ўвага клопату аб ветэранах і тых, хто пацярпеў ад наступстваў вайны. Дзяржава і грамадства аб'ядноўваюць намаганні, каб выказаць падзяку героям і забяспечыць ім дастойнае жыццё. У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны расказалі, як падтрымліваюць ветэранаў.

На 1 красавіка ў Беларусі пражывала 814 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, уключаючы 431 удзельніка і інваліда вайны, а таксама 6,4 тысячы асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны (з іх 5,7 тысяч — былыя вязні фашызму). З 2 па 8 мая будзе выплачана аднаразовая матэрыяльная дапамога. Па 5 тысяч рублёў атрымаюць інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях па абароне Айчыны да 3 верасня 1945 года.



2,5 тысячы рублёў складзе дзяржаўная дапамога асобам, узнагароджаным ордэнамі ці медалямі СССР за самаадданую працу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны; асобам, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых меж дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог; асобам, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 г. па 27 студзеня 1944 г. і ўзнагароджаным медалём «За абарону Ленінграда», асобам, узнагароджаным знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда».

Па 1, 5 тысячы рублёў выплацяць членам сем'яў ваеннаслужачых, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі (памерлі), прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны (мужам, якія не ўзялі новы шлюб, дзецям-інвалідам з дзяцінства (у тым ліку ўсыноўленым, удачароным), устаноўлена павышэнне пенсіі па указаных падставах у адпаведнасці з заканадаўствам; былым вязням, у тым ліку непаўналетнім, фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета, а таксама былым непаўналетнім вязням іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны, якім устаноўлена павышэнне пенсіі па названай падставе; інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў.

Акрамя таго, усе ветэраны і пацярпелыя ад вайны, якія маюць патрэбу ў доглядзе, ахоплены празнымі формамі дапамогі. У тым ліку 145 чалавек атрымліваюць дапамогу ў стацыянарных установах (сацыяльных пансіянатах, бальніцах), 1,4 тысячы чалавек забяспечаны сацыяльнымі паслугамі дома, а 339 — знаходзяцца пад роднасным доглядам з выплатай дапамогі (447,64 рубля з 1 лютага 2025 г.).

Да 25 сакавіка поўнасцю завершаны праверкі жыллёвых умоў усіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і пацярпелых ад наступстваў вайны. Выкананы неабходны рамонт жылых памяшканняў (ліквідаванне працёкаў, замена вокнаў, рамонт падлог), праверка і рамонт пячнога/газавага абсталявання (забеспячэнне бяспекі), устаноўка аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў.

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# «...НАШЫ КРАІНЫ ЗАСТАЛІСЯ ДОБРЫМІ СЯБРАМІ І НАДЗЕЙНЫМІ ПАРТНЁРАМІ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Аляксандр Лукашэнка адзначыў выключна канструктыўны характар узаемадзеяння Беларусі і Пакістана ў міжнародных арганізацыях. «Намаганні Беларусі ў ШАС хочам сфакусіраваць на вырашэнні не менш важных стваральных задач — развіцці сельскай гаспадаркі і забеспячэнні харчовай бяспекі. Ведаючы, якое вялікае значэнне Вы надаеце аграрнаму сектару, думаю, Вы мяне падтрымаеце. Мы выступілі з ініцыятывай аб арганізацыі асобнай экспазіцыі краін ШАС — «АграШАС» у рамках Міжнароднай сельскагаспадарчай выстаўкі «БЕЛАГРА-2025», якая пройдзе ў Мінску з 3 па 7 чэрвеня. Запрашаем узяць удзел у гэтай экспазіцыі дэлегацыю Пакістана, — адзначыў беларускі лідар. — У цэлым лічу, што сельская гаспадарка і ўсё, што з ёй звязана, з'яўляюцца драйверам нашага двухбаковага супрацоўніцтва».

Аляксандр Лукашэнка і Шахбаз Шарыф таксама абмяркоўвалі важную, далікатную тэму — працоўныя рэсурсы. «Мы ведаем, што гэта вялізны рэзерв — Пакістан. Вы валодаеце вялізнай колькасцю людзей, якія гатовы працаваць у Беларусі.

> **Мы дамовіліся з вамі, што зробім усё, каб нашы пакістанскія сябры — рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя — жадаючыя, маглі прыехаць у Беларусь і працаваць тут. Мы акажам ім адпаведную падтрымку. Мы таксама дамовіліся, што выпрацуем канкрэтны механізм прыезду сюды людзей для працы ў Беларусі. Нам яны вельмі будуць патрэбныя», — Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін аспект супрацоўніцтва.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўзаемадзеянне ў сферы сельскай гаспадаркі — шматграннае і мае доўгатэрміновыя перспектывы. «Пераканаы: мы будзем адштурхоўвацца ад таго, што будзем ствараць сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі ў Пакістане і па вытворчасці трактароў «Беларус», і прычэпных машын для апрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Мы зробім усё, каб вы былі ў гэтым зацікаўленыя і не пашкадавалі аб гэтым супрацоўніцтве», — прапанаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што дзякуючы аператыўнаму садзейнічанню Шахбаза Шарыфа ў Пакістане ўпершыню сертыфікаваны беларускія ветэрынарныя прэпараты. Беларускі бок разлічвае на пачатак паставак у бліжэйшы час. «Прапаную паскорыцца і перайсці да канкрэтных перагавораў па пастаўках беларускага насення збожжавых культур і кукурузы для вырошчвання ў Пакістане. Нашы профільныя міністэрствы з прыцягненнем дзелавых колаў дзвюх краін ужо да наступнага пасяўнога сезона павінны выйсці на рэальныя кантракты, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

> **— Ведаем, што ўрад Пакістана ставіць амбіцыйныя задачы па пераводзе да 2030 года трэці грамадскага транспарту на электрацягу. У нашага прадпрыемства «БКМ Холдынг» ёсць усе неабходныя кампетэнцыі ў частцы вытворчасці сучасных электробусаў і суперхуткіх зарадных станцый. Мы гатовыя лакалізаваць вытворчасць гэтай тэхнікі ў Пакістане, што знізіць яе кошт, створыць новыя працоўныя месцы, прыцягне прагрэсіўныя тэхналогіі і кампетэнцыі».**

Прэзідэнт прапанаваў разгледзець пытанне арганізацыі паставак сучасных кар'ерных самазвалаў БЕЛАЗ, грузавой і дарожна-будаўнічай тэхнікі МАЗ і «Амкадор» для патрэб вугальнай і меднаруднай галін, а таксама інфраструктурных праектаў Пакістана. «У сваю чаргу беларускія спажыўцы будуць рады пакістанскім таварам у магазінах. Па выніках беларуска-пакістанскага бізнес-форуму чакаем рост паставак вашай прадукцыі ў Беларусь, у прыватнасці рысу і мандарынаў, фармацэўтычнай і тэкстыльнай прадукцыі, спартыўных тавараў, адзення, абутку», — сказаў ён.

Па словах беларускага лідара, асаблівасць візіту Шахбаза Шарыфа заключаецца ў тым, што напярэдадні вельмі плённа папрацавалі члены ўрада абедзвюх краін, дзелавыя колы, якія абмяркоўвалі не толькі далёкія перспектывы супрацоўніцтва, але змаглі дамовіцца па канкрэтных пазіцыях і заключыць кантракты. «Калі мы аператыўна створым паветраны мост паміж Ісламабадам і Мінскам і падтрымаем паветраныя зносіны, то, я ўпэўнены, што мы вельмі сур'ёзна прасунемся ў гэтым напрамку. Тым больш, калі мы будзем прыцягваць працоўныя рэсурсы з Пакістана ў Беларусь (а гэта будзе), для людзей патрэбныя хуткія паветраныя зносіны. Мы гатовы ў гэтым напрамку працаваць», — запэўніў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што падчас гэтага візіту зроблена нямала. У гэтым, па яго словах, сур'ёзна дапамог і Наваз Шарыф. «Ён у нас выступаў як трацейскі суддзя. Я заўважыў, што ён практычна ўсе нашы пачынанні падтрымаў. Ён будзе рады, калі мы прасунемся ў нашых адносінах ужо на канкрэтнай базе», — падкрэсліў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Прэм'ер-міністру Пакістана за прыезд у Беларусь і выказаў спадзяванне на далейшыя сустрэчы, падчас якіх будуць зроблены сур'ёзныя крокі ў беларуска-пакістанскім супрацоўніцтве.

«Мы сапраўды гатовы працаваць разам і будзем рабіць усё, кабператварыць пагадненні і мемарандумы ў канкрэтныя дзеянні, — заявіў Шахбаз Шарыф. — Я буду рабіць усё, каб двухбаковыя адносіны станавіліся яшчэ больш эфектыўнымі і дасягалі новых вышынь». Ён заўважыў, што паміж краінамі ўжо заключана каля сотні пагадненняў і мемарандумаў па супрацоўніцтве. Цяпер неабходна дзейнічаць хутка разам, каб гэтыя пагадненні ператварыліся ў канкрэтныя дзеянні, заўважыў Шахбаз Шарыф.

«Ведаю ваш стыль работы — менш размоў, больш справы. Давайце дасягаць вынікаў, гэты падыход блізкі і мне, — звярнуўся ён да беларускага лідара. — Мы сапраўды гатовы працаваць разам, я буду працаваць з вамі і буду рабіць гэта шчыра. З усіх сіл буду старацца ператварыць гэтыя пагадненні і мемарандумы ў рэальныя вынікі».

## «МЫ ВЫЙШЛІ НА ДАМОЎЛЕНАСЦІ КАНКРЭТНАГА ХАРАКТАРУ»

Па выніках перагавораў лідараў быў падпісаны цэлы пакет адпаведных дакументаў.

Цырымонія абмену тэкстамі дагавораў і міжнародных дакументаў прайшла ў прысутнасці лідараў дзвюх краін. А затым яны пагаварылі з журналістамі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў абавязковасць Прэм'ер-міністра Пакістана, які абяцаў, што вялікай дэлегацыяй яны прыедуць у Беларусь, каб абмеркаваць перспектывы супрацоўніцтва. І сваё слова стрымаў. Беларускі лідар таксама павіншаваў пакістанскіх сяброў з нядаўнім заканчэннем святога месяца Рамадан. Што непасрэдна да перагавораў, то яны, па словах Прэзідэнта, прайшлі ў цёплай, даверлівай атмасферы. «Мы абмеркавалі шырокі спектр пытанняў, абмяняліся меркаваннямі па міжнародных і рэгіянальных праблемах.

> **Мы выйшлі на дамоўленасці канкрэтнага характару па развіцці нашых адносін у тэкстыльнай прамысловасці на прыкладзе канкрэтнага прадпрыемства ў Баранавічах. Вельмі важна, што нашы пакістанскія сябры паабяцалі нам дапамагчы спецыялістамі ў тэкстыльнай прамысловасці, накіраваўшы іх на работу ў тым ліку і ў Баранавічы», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Дасягнута дамоўленасць і аб тым, што ў найбліжэйшы час з Пакістана прыедуць спецыялісты з розных галін. «Няхай гэта будзе 100 тысяч, можа, 120—150 тысяч гэтых спецыялістаў. Мы гатовы прыняць іх у Беларусі і стварыць ім неабходныя ўмовы для работы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«У нас і Пакістана адзіная пазіцыя адносна далейшага развіцця і паглыблення палітычнага дыялога паміж нашымі краінамі, умацавання міжпарламенцкіх сувязяў, пашырэння дагаворна-прававой базы. Але ключавымі кірункамі супрацоўніцтва, безумоўна, застаюцца эканоміка і ўзаемны гандаль», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што ў лістападзе мінулага года ў Ісламабадзе бакі дамовіліся сканцэнтраваць намаганні на атрыманні практычных эканамічных вынікаў ад сумеснай работы. «Я рады канстатаваць, што ў нас агульнае бачанне прыярытэтаў. Першы і галоўны сярод іх — умацаванне харчовай бяспекі ў самым шырокім сэнсе гэтага слова. Гэта і пастаўкі сельгастэхнікі ў Пакістан, і арганізацыя зборкі беларускіх трактароў, прыцэпнай тэхнікі, і задавальненне попыту пакістанскага рынку на якаснае дзіцячае харчаванне, сухое малако, а таксама экспарт насення і ветэрынарных прэпаратаў. Усё гэта мы ўмеем рабіць і гатовыя падзяліцца вопытам з нашымі пакістанскімі сябрамі», — адзначыў Прэзідэнт. Ён падзякаваў Шахбазу Шарыфу за тое, што той пагадзіўся памяняць свой графік і замест кабінетнай работы выбраў наведванне аднаго з вядучых прадпрыемстваў па вытворчасці велікагрузных самазвалаў. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што там Прэм'ер-міністр канкрэтна зможа сказаць кіраўніцтву і працоўнаму калектыву, у чым мае патрэбу Пакістан і што БЕЛАЗ павінен зрабіць для Пакістана.

«У сваю чаргу, мы будзем рады бачыць у Беларусі больш прадуктаў з Пакістана. Мы таксама гатовы супрацоўнічаць з Пакістанам у плане паставак вашай прадукцыі на еўрапейскі рынак. Прынамсі, еўрапейцы з задавальненнем купяць вашу прадукцыю, яны ж санкцыі супраць вас не ўводзілі. Таму, калі ласка, скарыстайцеся Беларуссю, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, для таго, каб прасоўваць сваю прадукцыю на Захад», — прапанаваў Прэзідэнт пакістанскім партнёрам.

Бясспрэчным флагманам, які фарміруе аснову экспарту ў Пакістан, з'яўляецца трактарабудаўнічая галіна, звярнуў увагу беларускі лідар. Ён выказаў упэўненасць, што сёлета аб'ёмы паставак беларускіх трактароў у Пакістан будуць толькі ўзрастаць. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў ходзе перагавораў уздымалася пытанне паставак у Ісламскую Рэспубліку Пакістан камунальнай, грузавой і кар'ернай тэхнікі айчыннай вытворчасці. Беларускі бок прапанаваў пакістанскім сябрам разгледзець магчымасць арганізацыі ў сябе зборкі электробусаў. Шахбаз Шарыф адзначыў, што яны хацелі б развіваць у сябе гэтыя кампетэнцыі, а беларусы гатовы падзяліцца досведам і навучыць спецыялістаў.

> **«Рухаючая сіла ў пашырэнні беларуска-пакістанскага супрацоўніцтва — безумоўна, дзелавыя колы дзвюх краін, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Менавіта таму са спадаром Прэм'ер-міністрам прыбыла паважная дэлегацыя прадстаўнікоў бізнесу, якія, паводле добрай традыцыі, прадуктыўна папрацавалі з беларускімі калегамі на бізнес-форуме. І ўвогуле гэта асаблівасць нашых перагавораў і візіту Пакістанскай дэлегацыі, што прадстаўнікі дзелавых колаў і дзяржаўныя служачыя, члены ўрада разам вельмі сур'ёзна працавалі над канкрэтнымі праектамі».**

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, беларускі бок прапаноўвае пакістанскім прадпрымальнікам самыя спрыяльныя ўмовы для стварэння вытворчасцяў, арыентаваных на рынак не толькі Беларусі, але і ЕАЭС. «Я рады таму, што пакістанскія калегі настроены выкарыстоўваць усе існуючыя магчымасці і рэзервы для актывізацыі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з нашай краінай. Перакананы, што за гэтым візітам спадара Шахбаза Шарыфа ў Мінск будуць новыя візіты і сустрэчы, а сяброўскія адносіны паміж нашымі краінамі будуць і далей мацнець і прыносіць карысць народам Беларусі і Пакістана», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Шахбаз Шарыф падзякаваў беларускаму лідару і ўсім беларускім партнёрам за клопат аб пакістанскім народзе. «Я ведаю Вас як кіраўніка, які ведае, як трансфармаваць сваю краіну. Я стаў сведкам фенаменальнага прагрэсу, якога дасягнула ваша краіна пад Вашым кіраўніцтвам», — звярнуўся Прэм'ер-міністр Пакістана да Аляксандра Лукашэнкі. Па словах Шахбаза Шарыфа, пакістанскі бок шчыра зацікаўлены ў супрацоўніцтве з беларусамі. Ён заўважыў, што супрацоўніцтва моцных бакоў дзвюх краін можа не проста змяніць сітуацыю, а нават паўплываць на ход гісторыі. «Няма ні адной прычыны, каб мы не маглі атрымаць карысць ад вашага досведу ў розных галінах», — заявіў Шахбаз Шарыф.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што Пакістан паставіў амбіцыйную задачу па пераводзе да 2030 года трэці грамадскага транспарту на электрацягу. Аб гэтым казаў яшчэ яго брат Наваз Шарыф, калі быў Прэм'ер-міністрам. І ў гэтым кірунку вельмі дарэчы будзе дапамога беларускіх сяброў. Па яго словах, на глебе супрацоўніцтва ў гэтым кірунку Беларусь і Пакістан могуць стаць яшчэ бліжэй.

«Мы хочам вучыцца на вашым вопыце, выкарыстоўваць яго. Я ведаю, што Беларусь моцная ў вытворчасці абсталявання, у тым ліку для горназдабываючай прамысловасці. Ёсць кар'ерныя самазвалы і розная тэхніка. Пакістан мае багатыя мінеральныя рэсурсы, і гэты кірунак сумеснай дзейнасці можа быць вельмі перспектыўным. Можна зарабіць мільёны долараў у гэтай сферы. Думаю, што ў гэтых адносінах мы будзем выдатнымі партнёрамі», — падкрэсліў Шахбаз Шарыф. Ён таксама звярнуў увагу, што Пакістан — аграрная краіна, і супрацоўніцтва з беларускімі калегамі многае дасць пакістанскаму аграрна-прамысловаму комплексу.

«Дазвольце падзякаваць Вам ад усяго сэрца і ад усёй дэлегацыі, ад народа Пакістана за Вашу шчодрую прапанову і запрашэнне больш як сотні тысяч высокакваліфікаваных работнікаў з Пакістана прыехаць у Беларусь працаваць. Паверце, гэта прапанова зрабіла мой дзень яшчэ лепшым. Гэта сапраўдны падарунак, які я вязу з сабой з Беларусі», — сказаў Шахбаз Шарыф. Ён запэўніў, што ўсе пакістанскія спецыялісты, якія прыедуць працаваць у Беларусь, будуць выдатна падрыхтаваныя і чым змогуць, дапамогуць Беларусі. «Яны могуць стварыць той самы мост, які мы будуем паміж Мінскам і Ісламабадам», — заўважыў Прэм'ер-міністр.

Па традыцыі, на памяць аб гэтай сустрэчы Шахбаз Шарыф і Аляксандр Лукашэнка пасадзілі дрэва на тэрыторыі Палаца Незалежнасці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

МЕРКАВАННІ

# ЭКСПЕРТЫ — АБ ДЫРЭКТЫВЕ № 12: «ЗНАКАВЫ КРОК, НАШАГА СУВЕРЭНІТЭТУ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ

Падпісанне Прэзідэнтам Дырэктывы № 12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы» — свайго роду сведчанне сталасці нашага грамадства. Беларусы, будуючы сваю незалежную дзяржаву, дасягнулі таго ўзроўню развіцця як нацыя, калі можна сур'ёзна і з разуменнем не толькі гаварыць пра хлеб надзённы, але шукаць і знаходзіць сэнсы існавання і развіцця народа, краіны, яе суверэнітэту. Гэты дакумент не толькі для кіраўнікоў, яго павінен вывучыць кожны. Гэта, як было вобразна сказана, буквар грамадзяніна. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, зацверджаныя Дырэктывай, даюць канкрэтны адказ на важныя для асэнсавання саміх сябе пытанні — хто мы? па якой дарозе ідзём? якімі арыенцірамі кіруемся? Толькі ведаючы адказ на іх, насельніцтва пэўнай тэрыторыі сапраўды становіцца грамадзянамі пэўнай краіны.

«Гэта вельмі важны дакумент, — адзначыў у каментарыі БелТА **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ.** — Першыя ўказы па ідэалагічнай рабоце з'явіліся ў 2003 годзе, гэта, значыць, 22 гады таму. Адпаведна, сёння гэта тэма актуальная хаця б таму, што час змяніўся. Змяніліся і



інфармацыйныя сродкі як адны з галоўных інструментаў ідэалагічнай работы. Ідэалагічная вертыкаль, грамадскія аб'яднанні, палітычныя партыі і сродкі масавай інфармацыі — гэта асноўныя інструменты, якія падтрымліваюць ідэалагічную работу. Трэба было гэта актуалізаваць, прывесці да сучаснага стану рэальнасці. Так, падпісанне Дырэктывы № 12 — гэта важна і вельмі своечасова».

Міністр інфармацыі падкрэсліў, што цяпер неабходна дэталёва вывучыць кожны пункт дырэктывы. «Нават першае азнаямленне паказвае, што дакумент вельмі глыбокі, яго трэба грунтоўна асэнсаваць, прапусціць праз сябе і выкарыстоўваць. Але выкарыстоўваць з розумам, таму што няма нічога горшага, чым проста рабіць выгляд, што ты займаешся ідэалагічнай працай. Гэта выклікае толькі абурэнне. Калі рабіць усё прадумана, правільна выкарыстоўваць ідэалагічныя інструменты, у тым ліку СМІ, тады гэта будзе на карысць усім».



**Таццяна ГАГАКАВА, начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалогіі і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама,** лічыць, што дырэктыва прынятая своечасова, бо такое рашэнне саспела, яно па-сапраўднаму выверана практыкай. «Сведчаннем таму апошнія электаральныя кампаніі, якія прайшлі спакойна, арганізавана, на высокім узроўні. Апошняе таксама могуць запісаць сабе ў актыў ідэалагічныя работнікі. Не варта забываць, што адной з галоўных мэт ідэалагічнай работы і з'яўляюцца стабільнасць і спакой у грамадстве», — сказала яна.

Надзвычай важным, на думку Таццяны Гагакавай, з'яўляецца той факт, што дакумент утрымлівае тэарэтычны курс асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы, а яшчэ ў ім прапісаны механізмы рэалізацыі ідэалагічнай работы. «Яшчэ пры распрацоўцы дакумента мы ўлічвалі вопыт работы нашага актыву ў раёнах, бралі іх напрацоўкі, прапановы з тым, каб папярэджваць некаторыя выклікі ці праблемы грамадства, а не разбірацца з іх наступствамі,» — падзялілася яна.

«Я вельмі рада, што дакументам прадугледжана замацаваная адказнасць кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый усіх форм уласнасці за якасць ідэалагічнай работы, — сказала Таццяна Гагакава. — Раней мы найчасцей ішлі ў калектывы дзяржаўных прадпрыемстваў. Але ж эканамічна і палітычна актыўныя людзі працуюць не толькі там, многія заняты ў прыватным сектары. Цяпер у кожным калектыве будзе работнік, адказны за гэты кірунак».



**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў, доктар гістарычных навук** звяртае ўвагу на тое, што перш за ўсё дырэктыва ўдасканальвае сістэму ідэалагічнай работы ў адпаведнасці з сучаснымі выклікамі, якія стаяць перад нашым грамадствам і дзяржавай ва ўмовах гібрыдных войн, фарміравання шматпалярнага светаўладкавання. «Ідэалагічная работа накіроўваецца на ахоп арганізацый усіх форм уласнасці, улік рэальных запытаў насельніцтва, забеспячэнне эфектыўнай камунікацыі ўлады і грамадства, — адзначае дэпутат. — Пры гэтым выразна акрэслена мэта — пабудова сацыяльна справядлівага грамадства праз фарміраванне ўсебакова развітой асобы, здольнай адстойваць нацыянальныя інтарэсы».

Вячаслаў Даніловіч падкрэслівае важнасць таго, што ў дырэктыву закладзены прынцып адзінства ідэалагічнай, кіраўнічай, гаспадарчай і арганізатарскай дзейнасці. «Абсалютна абгрунтавана пад асаблівы кантроль дзяржавы пастаўлена ідэалагічная работа ў сферах адукацыі, культуры, навукі, спорту, этнаканфесійных адносін, сямейнай, маладзёжнай, інфармацыйнай і гістарычнай палітыкі, — лічыць парламентарый. — Падкрэслена важнасць укаранення і распаўсюджвання адзіных дзён інфармавання, справаздач улад перад насельніцтвам, дыялогавых пляцовак, грамадскіх прыёмных, сустрэч у працоўных калектывах і па месцы жыхарства, грамадскіх абмеркаванняў рашэнняў, якія прымаюцца».

Дэпутат канстатуе, што ў Беларусі сфарміравана ўласная мадэль грамадскага развіцця, якая з'яўляецца ўвасабленнем ідэалогіі беларускай дзяржавы, якая, у сваю чаргу, адлюстроўвае нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа.

«Зацверджаныя асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы ўтрымліваюць уяўленні аб фарміраванні беларускай нацыі, якая належыць да ўсходнеславянскай цывілізацыі, аб асноўных этапах фарміравання беларускай дзяржаўнасці, ролі народаўладдзя і прэзідэнцкай рэспублікі, — канкрэтызуе Вячаслаў Даніловіч. — Падкрэслена важнасць патрыятызму, традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцяў, сацыяльнай справядлівасці, сацыяльна арыентаванай эканамічнай палітыкі, разумнага балансу розных форм уласнасці і гаспадарання, балансу інтарэсаў розных сацыяльных груп».

Дэпутат выказвае ўпэўненасць, што рэалізацыя дырэктывы з'яўляецца надзейным фундаментам захавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, забеспячэння нацыянальнай бяспекі, прагрэсіўнага развіцця беларускага народа і самарэалізацыі чалавека ў гармоніі з грамадствам і дзяржавай.



Ідэалогія праз сродкі масавай інфармацыі становіцца магутным інструментам уздзеяння на свядомасць грамадзян, што ў сваю чаргу ўплывае на эканоміку і грамадска-палітычнае развіццё грамадства, адзначае **Аляксандр ГАРОШКІН, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.** «На сёння, улічваючы патрэбы дзяржавы і інтарэсы народа, фарміраванне ідэалогіі павінна ісці ад рэальнага жыцця, — гаворыць сенатар. — Ідэалогія — першасная і абавязковая. Усе рашэнні ў дзяржаве і грамадстве павінны ёй адпавядаць. Рэалізацыя асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы будзе садзейнічаць захаванню дзяржаўнага суверэнітэту, забеспячэнню нацыянальнай бяспекі, развіццю беларускага народа як унікальнай гістарычнай супольнасці, самарэалізацыі чалавека ў гармоніі з грамадскімі патрэбамі.



«Самае галоўнае, што гэта дырэктыва — не проста набор лозунгаў, — падкрэслівае **РУСЛАН ШКОДЗІН, член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў.** — Яна павінна стаць кіраўніцтвам да дзеяння для кожнага беларуса. Усё роўна, працуеш ты на заводзе, вучыш дзяцей або займаешся бізнесам. Ты павінен разумець, якія каштоўнасці мы абараняем і як можна зрабіць свой унёсак у развіццё краіны і грамадства».

Вядома, знойдуцца тыя, хто будзе крытыкаваць, маўляў, гэта ўсё «вяртанне ў мінулае» і «абмежаванне свабоды», заўважае дэпутат. «Але свет мяняецца так хутка, што без дакладных арыенціраў можна лёгка згубіцца. А калі ў цябе ёсць трывалы падмурак, то любыя штормы не страшныя, — лічыць Руслан Шкодзін. — Калі раней хтосьці мог сумнявацца, у якім кірунку рухацца, то цяпер усё вельмі ясна. У прыярытэце — моцная і незалежная Беларусь з упорам на ўласныя сілы, традыцыі і гісторыю». Гэта не значыць, што ў нас не будзе месца для новых ідэй. «Але яны мусяць адпавядаць базавым прынцыпам, на якіх будуецца беларускае грамадства», — падкрэслівае дэпутат.

## ЯКІЯ ДАКУМЕНТЫ БЫЛІ ПАДПІСАНЫЯ ПА ВЫНІКАХ ПЕРАГАВОРАЎ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ І ШАХБАЗА ШАРЫФА

**✓ Міжурадавае пагадненне аб рэадмісіі.**

**✓ Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствамі ўнутраных спраў.**

**✓ Міністэрствы абароны дзвюх дзяржаў таксама падпісалі пагадненне аб ваенным супрацоўніцтве.**

**✓ Падпісана Праграма («Дарожная карта») ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам абароннай прадукцыі Ісламскай Рэспублікі Пакістан на 2025—2027 гады.**

**✓ Паміж Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам па змене клімату і каардынацыі навакольнага асяроддзя Ісламскай Рэспублікі Пакістан падпісаны План мерапрыемстваў («Дарожная карта») па рэалізацыі Мемарандума аб супрацоўніцтве ў галіне на 2025—2029 гады.**

**✓ Таксама падпісаны дакументы ў галіне эканамічнага супрацоўніцтва, падтрымкі прадпрымальніцтва, развіцці гандлю паміж арганізацыямі і прадпрыемствамі Беларусі і Пакістана.**



## МІЖПАРЛАМЕНЦКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І ПАКІСТАНА БУДЗЕ РАЗВІВАЦЦА

### З Прэм'ер-міністрам Пакістана сустрэліся спікеры абедзвюх палат Нацыянальнага сходу



Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА на сустрэчы з Шахбазам Шарыфам адзначыла, што паміж парламентамі Беларусі і Пакістана склаліся добрыя адносіны. Яна расказала, што на палях 150-й Асамблеі МПС нядаўна сустракалася са сваім пакістанскім калегам. У беларускім парламенце ёсць рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам Пакістана. «Вядома, мы зробім усё, каб выкананне тых дамоўленасцяў, якія дасягнуты вамі, лідарамі нашых краін, было на кантролі і ў нас, у парламентарыяў», — сказала Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава адзначыла важнасць рэгіянальнага супрацоўніцтва. «Мы нацэльваем на тое, каб супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі нашых краін было больш эфектыўным», — заявіла спікер, дадаўшы, што ўсе вобласці Беларусі заключылі дагаворы аб супрацоўніцтве з правінцыямі Пакістана. Аднак гэту работу трэба інтэнсіфікаваць, упэўнена яна.

«Ісламская Рэспубліка Пакістан для нас дружалюбная краіна. І мы шчыра рады таму, што вы сёння са сваімі калегамі тут, у нас у Беларусі», — адзначыла спікер.

Таксама яна падзякавала пакістанскім калегам за падтрымку і сумесную работу на міжнародных пляцоўках і ў міжнародных арганізацыях.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** падчас сустрэчы выказаў упэўненасць, што «кантакты па лініі парламенцкага супрацоўніцтва будуць развівацца гэтак жа актыўна, як паміж нашымі дзяржавамі».

Ігар Сергяенка адзначыў, што паміж Палатай прадстаўнікоў і Нацыянальнай асамблеяй парламента Ісламскай Рэспублікі Пакістан дзейнічае мемарандум аб узаемаразуменні. Пэўны свежы імпульс у развіцці кантактаў летась надаў візіт парламенцкай дэлегацыі Пакістана на чале са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Ісламскай Рэспублікі Пакістан Сардарам Аязам Садзікам. Парламенцкая дэлегацыя, у якую ўваходзілі прадстаўнікі палітычных партый, была прынята Прэзідэнтам Беларусі. Праведзены сустрэчы з парламентарыямі, а таксама ў шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, наведаны канкрэтныя прадпрыемствы. Былі намечаны далейшыя крокі для актывізацыі парламенцкага супрацоўніцтва.

Ігар Сергяенка падкрэсліў, што прымаць такога вядомага палітыка, як Прэм'ер-міністр Пакістана Шахбаз Шарыф, па-сапраўднаму вялікі гонар. Тым больш што пакістанскі госць валодае найбагацейшымі ведамі і вопытам парламенцкай дзейнасці.

## ШАХБАЗ ШАРЫФ НАВЕДАЎ БЕЛАЗ



Аб тым, што Прэм'ер-міністр Пакістана Шахбаз Шарыф змяніў графік свайго візіту ў Беларусь, журналісты даведаліся ад Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. «Я ўдзячны Прэм'ер-міністру, што ён замест кабінетнай работы згадзіўся змяніць свой графік і накіравацца на адно з вядучых нашых прадпрыемстваў па вытворчасці велікагрузных самазвалаў. Ён там канкрэтна зможа сказаць кіраўніцтву і працоўнаму калектыву, у чым мае патрэбу Пакістан і што БЕЛАЗ павінен зрабіць для Пакістана», — расказаў беларускі лідар.

На БЕЛАЗ высокага пакістанскага госця суправаджаў Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын. Шафбазу Шарыфу паказалі музей прадпрыемства, вытворчы цэх. Убачыў ён і славуты самазвал БЕЛАЗ-75710 — герой Кнігі рэкордаў Гінеса па грузападымальнасці.

Прэм'ер Пакістана высока ацаніў узровень аснашчанасці БЕЛАЗа, якасць вырабляемай тэхнікі і падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за параду наведаць гэты завод, паведамляе БелТА. Ён выказаў упэўненасць у тым, што супрацоўніцтва з прадпрыемствам будзе толькі набіраць абароты, а таксама запэўніў, што ў час наступнага візіту ў Беларусь абавязкова зазірне на БЕЛАЗ.

По словах намесніка міністра прамысловасці Андрэя Кузняцова, на цэментнае прадпрыемства Пакістана нядаўна была пастаўлена 45-тонная машына. «Сёння члены дэлегацыі на чале з Прэм'ер-міністрам азнаёміліся з тэхналагічным працэсам вырабу гэтай машыны, агледзелі мадэльны рад і зацікавіліся ў далейшым выкарыстанні нашай тэхнікі ў горназдабываючай прамысловасці Пакістана», — расказаў ён і дадаў, што Шахбаз Шарыф ужо даў распараджэнне аб тым, каб вызначыцца з патрэбамі галіны.



Фота БелТА.

## ПАДТРЫМКА МСП, АГРАДРОНЫ, ЛАГІСТЫКА

### Якія дакументы падпісалі на Беларуска-пакістанскім бізнес-форуме

На палях Беларуска-пакістанскага бізнес-форуму ў Мінску, які прайшоў 10 красавіка, было падпісана восем дакументаў аб супрацоўніцтве паміж кампаніямі, паведамляе БелТА.

Так, на форуме было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і Упраўленнем па развіцці гандлю Пакістана, а таксама пагадненне па абмене паштовымі адпраўленнямі.

Былі падпісаны таксама два мемарандумы аб узаемаразуменні паміж Беларускай універсальнай таварнай біржай і Усепакістанскай асацыяцыяй прадаўцоў драўніны, паміж Беларускім фондам фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў і Упраўленнем па справах малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Пакістана.

Акрамя гэтага, быў падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні па пастаўках катанізаванага льновалакна ў 2025 годзе паміж «Аршанскім ільнокамбінатам» і пакістанскай кампаніяй Mercury. З гэтай жа кампаніяй ТАА «Біяпрамсэрвіс» заключыла кантракт аб намерах пастаўкі алеяў, а ЗАТ «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы» — пагадненне аб супрацоўніцтве па пастаўках аградронаў.

Дагавор транспартнай экспедыцыі таксама быў заключаны на форуме паміж транспартна-лагістычнымі кампаніямі ПГУП «Белатэкаўта» і Best Trans International.



Фота БелТА.

У рамках візіту дэлегацыі Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліку Беларусь у Мінску прайшоў Беларуска-пакістанскі бізнес-форум. Удзел у ім узялі прадстаўнікі прадпрыемстваў дзвюх краін, якія нацэлены на абмеркаванне магчымасцяў супрацоўніцтва і абмен вопытам з ключавымі ігракамі лёгкай, харчовай, дрэваапрацоўчай, тытунёвай прамысловасці, фармацэўтыкі, горназдабыўной галіны, здабычы і апрацоўкі каштоўных камянёў.

Форум праводзіла Беларуская гандлёва-прамысловая палата ў супрацоўніцтве з Упраўленнем па развіцці гандлю Пакістана.

## ЯКІ ЎМАЦОЎВАЕ ПАДМУРАК ІДЭНТЫЧНАСЦІ»



**Віктар АНАНІЧ, старшыня праўлення Беларусбанка, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах,** як кіраўнік буйнога прадпрыемства разумее значнасць ідэалагічнага складніка ў рабоце. «За дзесяцігоддзі ў калектыве нашага банка ўдалося выбудаваць дастаткова эфектыўную вертыкаль і сістэму ўцягвання кожнага работніка ў ідэалагічнае жыццё банка і краіны, — адзначае ён. — Гэта дазваляе дайсці не проста да кожнай установы банка, але і да кожнага работніка. «Беларусбанк — важны элемент эканамічнага кампанента дзяржаўнай ідэалогіі. Разумеючы нашу значнасць у маштабах краіны і грамадства, сваю стратэгію дзейнасці выбудоўваем на тых жа прынцыпах, што ляжаць у аснове беларускай эканамічнай мадэлі: на працавітасці і прафесіяналізме як універсальных мерках сацыяльнага поспеху і грамадскага прызнання. Мы стварылі ўсе ўмовы для ўдзелу членаў працоўнага калектыву ў прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў, унясенні прапаноў, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці работы банка і яго інавацыйнасці, а значыць і на паляпшэнне ўзроўню жыцця народа ў цэлым.

Своечасовае гэта рашэнне яшчэ і таму, лічыць Віктар Ананіч, што ў нашым грамадстве адбываюцца сур'ёзныя пакаленчыя змены: у эканамічна актыўную фазу жыццёвага цыклу ўступае пакаленне, з якім неабходна шукаць новыя формы ўзаемадзеяння. «Гэтыя людзі прыходзяць на нашы прадпрыемствы — і задача кожнага кіраўніка выпрацаваць прадуманыя падыходы, каб уцягнуць іх у рэалізацыю дзяржаўнай ідэалогіі, — адзначае сенатар. — Бо ад гэтага залежыць наша здольнасць захавання дзяржаўнага суверэнітэту, падтрымання эканамічнай і нацыянальнай бяспекі».



**Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў,** звяртае ўвагу на вельмі істотны момант: палажэнні Дырэктывы № 12 датычацца прадпрыемстваў усіх форм уласнасці. І гэта вельмі важна. «У грамадстве склалася сітуацыя, што ў многіх кампаніях, асабліва з замежным капіталам і прыватнай формы ўласнасці, паняцце «ідэалогія беларускай дзяржавы» асацыюецца ў лепшым выпадку са спецкурсам ва ўніверсітэце, — заўважае яна. — А гэта ж велізарная і складаная сістэма, падмурак нашай незалежнасці і цэласнасці. І ўдзельнічаць у яе рэалізацыі павінны ўсе, кожны грамадзянін краіны, незалежна ад узросту, сферы дзейнасці і сацыяльнага статусу. Так, многім суб'ектам гаспадарання цяпер давядзецца няпроста, але заўсёды ёсць тыя, хто гатовы дапамагчы і падзяліцца перадавым вопытам у плане пабудовы ідэалагічнай работы.



Дырэктыва № 12 стварае прававую і арганізацыйную аснову для сістэмнай работы ўсіх інстытутаў улады. Размова ідзе не толькі аб дзяржаўных структурах, але і аб грамадзянскай супольнасці, СМІ, адукацыі, падкрэслівае **Таццяна ІГНАЦЮК, дырэктар Бярозаўскага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі** па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці: «Напрыклад, узмацненне ролі сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у навучальных праграмах дасць магчымасць сфарміраваць у падрастаючага пакалення дакладнае разуменне нацыянальных інтарэсаў. Акрамя таго, дакумент падкрэслівае важнасць сацыяльнай справядлівасці як неад'емнай часткі нашай мадэлі развіцця. Гэта наўпрост звязана з падтрымкай шматдзетных сем'яў, аховай працы, даступнасцю адукацыі і аховы здароўя — усім тым, што ўжо з'яўляецца візітнай карткай беларускай дзяржавы».

## ДЫРЭКТЫВА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА

9 красавіка 2025 года была падпісана Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы». Дакумент стаў вынікам шматгадовай работы па фарміраванні асноў духоўнага развіцця грамадства, стварэнні механізмаў абароны маральных каштоўнасцяў беларускага народа.

Адметнай рысай беларускага народа з'яўляецца ўдумлівы падыход да рашэння праблем. Яскравым прыкладам усебаковага разгляду праблемы, дэталізацыі палажэнняў і цеснага ўзаемадзеяння тэарэтыкаў і практыкаў выступае Дырэктыва № 12. З'яўляючыся развіццём палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дакумент увабраў у сябе ўвесь шматвяковы досвед развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці, спрадвечныя традыцыі і практычныя напрацоўкі ўсіх галін улады.

Прапрацоўка яе палажэнняў пачалася некалькі гадоў таму, а ў звароце Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі да Нацыянальнага сходу і народа ў 2023 годзе было падкрэслена: «Тэмы, якія мы абмяркоўваем, — ад жыцця. У цэнтры рашэнняў, якія прымаем, — імкненне да захавання міру, стваральная праца на карысць будучыні Беларусі, сацыяльная справядлівасць. Гэта нашы дэмакратычныя каштоўнасці, сапраўдныя каштоўнасці».

У 2024 годзе рашэннем Усебеларускага народнага сходу былі прыняты Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына дзяржавы, якія дэталізавалі шэраг палажэнняў Канстытуцыі краіны ў частцы, што датычыцца гарантавання бяспекі ў розных сферах. Нарэшце ў 2025 годзе ўдакладнены асновы ідэалогіі і шляхі іх рэалізацыі.

Сам дакумент і дадатак абагульняюць дасягненні тэорыі і практыкі ідэалагічнай работы, наяўныя на сённяшні дзень. Прычым першая частка дакумента дэталізуе мэты, задачы, аб'екты, суб'екты ідэалагічнай дзейнасці, мерапрыемствы па яе ўдасканаленні і якасным напаўненні. Па сутнасці гэта праграмны дакумент, дзе пастаўлены канкрэтныя задачы па сістэмным вырашэнні пытанняў, якія маюць прыярытэтнае значэнне для краіны, які мабілізуе дзяржаўныя органы і грамадства на прыняцце мер для дасягнення вызначаных у ім мэт.

Прычым мэтай ідэалагічнай работы замацавана пабудова сацыяльна справядлівага грамадства праз фарміраванне ўсебакова развітой асобы, якая адстойвае нацыянальныя інтарэсы.

У другой частцы дакумента, Асновах ідэалогіі беларускай дзяржавы, раскрыты тэарэтычныя палажэнні. Простай, вельмі даступнай мовай выкладзены складаныя, асноватворныя навукова-філасофскія пытанні, сярод якіх — дасягненні беларускай мадэлі грамадскага развіцця, сутнасць ідэалогіі і змест яе кампанентаў.

Сярод складаемых частак ідэалогіі беларускай дзяржавы названы:

— культурна-гістарычная — комплекс сталых перакананняў аб паходжанні народа, фарміраванні і развіцці яго самасвядомасці ад самабытнай этнічнай супольнасці да нацыі, якая ўсведамляе сваю прыналежнасць да ўсходнеславянскай цывілізацыі;

— палітычная — сістэма ўяўленняў народа аб асноўных этапах фарміравання беларускай дзяржаўнасці, умовах станаўлення і асаблівасцях інстытутаў дзяржавы, грамадзянскай супольнасці, ступені іх адпаведнасці традыцыям, сучасным патрэбам і інтарэсам нацыі, напрамках і шляхах далейшага развіцця гэтых інстытутаў, а таксама аб месцы беларускай дзяржавы на міжнароднай арэне, яе мэтах, прынцыпах і прыярытэтах;

— эканамічная — сістэма поглядаў адносна мадэлі арганізацыі эканамічнага жыцця краіны, якая прадугледжвае разумны баланс розных форм уласнасці і гаспадарання, разуменне ролі дзяржавы ў эканамічных працэсах, уяўленне аб справядлівым размеркаванні нацыянальнага багацця;

— сацыяльная — сукупнасць ідэй аб салідарнасці, сацыяльнай справядлівасці, маральнасці, патрыятызме, абавязках, правах і свабодах чалавека, балансе інтарэсаў розных сацыяльных груп.

Яны раскрываюць глыбіню паняцця ў даступнай для ўспрымання форме.

***Гэты ўсёабдымны дакумент накіраваны на развіццё і стваральную працу, з'яўляецца своечасовым адказам на спробы разбурыць ментальную сферу нацыі, замяніўшы рэальнасць віртуальнымі канструкцыямі. Ён павінен стаць настольнай кнігай для кіраўнікоў усіх узроўняў, незалежна ад формы ўласнасці, паколькі менавіта кіраўнік з'яўляецца галоўнай асобай, якая на практыцы рэалізуе палажэнні ідэалогіі нацыянальнай дзяржаўнасці.***

***Гатоўнасць абараняць канстытуцыйны лад, суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь, фарміраванне пазітыўнага вобразу сваёй краіны, умацаванне сувязі пакаленняў, захаванне і папулярызацыя ўласных традыцый і духоўных каштоўнасцяў — свяшчэнны абавязак кожнага беларуса. Менавіта ў гэтым — кансалідацыі грамадства ў інтарэсах паступальнага развіцця краіны — глыбінная ідэя дакумента, у якім замацаваны механізмы і шляхі дасягнення выніку.***

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук, прафесар.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (Организатор аукциона) по поручению **ОАО «Лошницкий комбикормовый завод»** (Продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

- **весовая для автомашин с инвентарным № 613/С-14084, общей площадью 140,7 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г;**
- **зерносклад 1, ёмк. 3200 т с инвентарным № 613/С-14085, общей площадью 1 235,4 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/2;**
- **зерносклад 2, ёмк. 3200 т с инвентарным № 613/С-14086, общей площадью 1 168,2 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/3;**
- **склад 3 с инвентарным № 613/С-14087, общей площадью 880,9 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/4;**
- **навес ж/б с инвентарным № 613/С-14088, общей площадью 764,2 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/1;**
- **здание многофункциональное с инвентарным № 613/С-15474, общей площадью 77 кв. м, адрес: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г/5 (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623070004601000633, площадью 1,2763 га, адрес земельного участка: Минская обл., Крупский р-н, Крупский с/с, п. Крупский, ул. Пушкина, 2Г.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 475 269,55** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 47 526,00** бел. руб.

**Стоимость снижена на 20 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.02.2025.

Аукцион состоится **26.04.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.04.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64; 8 (029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (01777) 25266; 8 (029) 312-28-85.**

УНН 600033881

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Адванта Технолоджи», УНП 291859037, 224024, г. Брест, ул. Красногвардейская, 114Б/5 |
| **Предмет электронных торгов: Контейнер iBox сплошной, на ножках с крышкой (400 ед.),** по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 114Б/5 | **Начальная цена с НДС 20 % – 140 800,00 бел. руб.** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.05.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.05.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные данные:** **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

**ООО «Юридическая компания Аспект»**
**проводит шестые повторные публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущественных прав ликвидируемого юридического лица – иностранного унитарного предприятия «Юколанефть»**

| № п/п | Наименование лота | Начальная цена без НДС, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «АРСнефть» (УНП 291047728) на общую сумму 39 876,99 бел. руб. | 13 230,23 | 661,51 | 1 323,02 |
| 2 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «Фолоуми» (УНП 193120458) на общую сумму 2 745,88 бел. руб. | 911,02 | 45,55 | 91,10 |

*Торги назначены на **28.04.2025 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4 этаж).** Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **25.04.2025 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** р/с BY23TECN30121503000130000000 в ОАО «ТЕХНОБАНК», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 192140296 |

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Дебиторская задолженность» по ссылке https://aspekt-avs.by/aykciony_info/

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» 27.08.2024 (стр. 6), 22.10.2024 (стр. 14), 13.11.2024 (стр. 12), 22.01.2025 г. (стр. 14), 08.02.2025 г. (стр. 12), 05.03.2025 г. (стр. 8)

Дополнительная информация о порядке проведения торгов по телефону +375 (44) 5986627, в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомление с документами на лот возможно по месту проведения торгов после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** *(Организатор аукциона)* по поручению **открытого акционерного общества «Весейский Покров»** *(Продавец)* проводит открытый аукцион

**по продаже административного здания**
**с инв. № 640/С-87804, общей площадью 508,1 кв. м, расположенного на земельном участке площадью 0,2036 га *(право аренды по 13.06.2033)*, с кадастровым номером 624687201401000050, по адресу: Минская область, Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Калита, ул. Центральная, 4.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **38 279,92** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 827,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **16.05.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.05.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65; 8 (029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра: 8 (01795) 4-82-57; 8 (029) 340-15-01.**

УНН 600043258

# ДАРОГА ДА МАРСА

## Наша краіна плануе ўдзельнічаць у стварэнні Расійскай арбітальнай станцыі



**Пра гэта напярэдадні Дня касманаўтыкі распавёў начальнік упраўлення аэракасмічнай дзейнасці НАН Беларусі Пётр ВІЦЯЗЬ.** «Вядома, мы гатовыя і стараемся ўдзельнічаць у тых праграмах, у якіх маглі б прынесці карысць, па меры нашых магчымасцяў. Таму мы абмяркоўваем з «Раскосмасам» гэтыя планы і па месяцовай праграме, і па новай арбітальнай станцыі, якая сёння распрацоўваецца па меры магчымасцяў. Стварэнне Расійскай арбітальнай станцыі (РАС) пачнецца ў 2027 годзе, яе фарміраванне завершыцца ў 2032-2033 гадах. Пры гэтым пілатуемыя палёты на РАС пачнуцца з 2028-га. Станцыя стане базай расійскіх касманаўтаў пасля спынення існавання МКС. Паводле задумы распрацоўшчыкаў, РАС дазволіць адпрацаваць тэхналогіі, якія неабходныя для падарожжаў да іншых планет, у першую чаргу да Марса, а таксама на Месяц. Вывад Міжнароднай касмічнай станцыі з эксплуатацыі запланаваны на 2030 год», — адзначыў Пётр Віцязь. Ён падкрэсліў, што задача навукоўцаў не проста вывучаць і пазнаваць, але і спрыяць эканамічнаму развіццю ўсіх галін народнай гаспадаркі шляхам выкарыстання касмічных тэхналогій на карысць чалавека.

### БЕЛАРУСКІ СПАДАРОЖНІК УЖО ГАТОВЫ ДА ПАЛЁТУ

**Дырэктар унітарнага прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЗАЛАТОЙ** паведаміў, што цяпер у нашай краіне выконваюцца дзве работы па даследаванні калязямной прасторы. «Адна з іх звязана са стварэннем уласнага спадарожніка Акадэміі навук. Ён ужо практычна гатовы, прайшоў усе наземныя выпрабаванні, прымерку да пускавога кантэйнера. Зараз мы чакаем запуску апарата. Як мяркуецца, гэта адбудзецца ў трэцім квартале гэтага года», — падкрэсліў Сяргей Залатой.

Ён нагадаў, што летась Прэзідэнт падпісаў указ аб рэалізацыі праграмы па стварэнні расійска-беларускага апарата дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з разрашэннем 35 сантыметраў. На дадзеным этапе беларускае прадпрыемства «Пеленг» стварае мэтавую апаратуру, а прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы» НАН Беларусі мадэрнізуе наземную інфраструктуру Беларускай касмічнай сістэмы для работы з гэтым спадарожнікам.

«Канструктарская дакументацыя гэтай праграмы выпушчана ў поўным аб'ёме. Закуплена камплектацыя для мэтавай апаратуры і вядзецца зборка блокаў. Да сярэдзіны гэтага года будзе гатовы габарытна-масавы макет мэтавай апаратуры і ўзор для наземных электрычных выпрабаванняў. Яго даставяць у Маскву для інтэграцыі з інжынерным макетам спадарожніка. Запуск апарата плануецца ў 2028 годзе», — распавёў Сяргей Залатой.

Выконваецца таксама праграма Саюзнай дзяржавы «Комплекс-СД», у рамках якой ствараецца групоўка малых апаратаў вагой 10 кілаграмаў і 30 кілаграмаў. «На іх усталёўваецца апаратура для даследавання калязямной прасторы, у тым ліку для адсочвання касмічнага смецця, зандзіравання іанасферы, вывучэння сонечных з'яў. Па планах, апараты да запуску будуць гатовыя ў наступным годзе. Зараз падрыхтаваны асобны праект Саюзнай дзяржавы па запуску гэтых апаратаў на арбіту. Цяпер праект праходзіць узгадненне. Мы спадзяёмся, што ў канцы гэтага года праект пачнецца з рэалізацыі асобных падпраграм, каб, хутчэй за ўсё, у 2027-м мы выйшлі на пускавую кампанію», — дадаў дырэктар прадпрыемства.

### «ЗРОБЛЕНА Ў КОСМАСЕ»

Год таму назад **першая беларуская жанчына-касманаўт, Герой Беларусі Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ** падчас касмічнага палёту выканала шэраг эксперыментаў у космасе. Яны былі праведзены для таго, каб развіваць іх на Зямлі, расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення аэракасмічнай дзейнасці НАН Беларусі Іван БУЧА.**

Тады было выканана сем эксперыментаў, пяць з якіх — навукова-даследчыя і яшчэ два — у галіне касмічнай адукацыі. Намеснік начальніка ўпраўлення лічыць, што кожны з іх быў важным. Пастаноўшчыкамі эксперыментаў з беларускага боку з'яўляліся навуковыя арганізацыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Эксперыменты тычыліся біялогіі, фізіялогіі, аўтаномнага функцыянавання касмічных станцый.

Эксперыменты з бялком і бактэрыямі праводзіліся для таго, каб выкарыстоўваць іх для паляпшэння харчавання не толькі касманаўтаў, але і ў выглядзе дабавак для харчавання людзей з прафесіямі, якія патрабуюць вялікіх выдаткаў энергіі, фізічных і маральных сіл. Усе эксперыменты ў космасе былі праведзены, каб развіваць іх на Зямлі. Потым айчынныя інстытуты працягнулі гэтую працу.

Вельмі цікавыя спробы працягнутыя ў рамках праекта SIRIUS-23, у якім таксама прымала ўдзел Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Іван Буча ўдакладніў, што гэта эксперымент па дванаццацімесячнай ізаляцыі экіпажа з шасці чалавек, які адбыўся з лістапада 2023-га па лістапад 2024 года ў Інстытуце медыка-біялагічных праблем Расійскай акадэміі навук.

«У гэтай ізаляцыі прымала ўдзел навуковы супрацоўнік Інстытута фізіка-арганічнай хіміі НАН Беларусі Вольга Масціцкая. Таксама там быў праведзены яшчэ адзін дадатковы эксперымент. Ён тычыўся аранжарэі, якая можа прымяняцца на касмічных аб'ектах. Гэтыя распрацоўкі аказаліся паспяховымі, далейшая іх рэалізацыя будзе прадоўжана ў новай касмічнай праграме, якая фарміруецца НАН Беларусі і зацікаўленымі ведамствамі. Яна будзе рэалізоўвацца з 2026-га па 2030 год», — адзначыў Іван Буча.

### КАЛІ ТРЭБА — ПАЛЯЦІМ!

Як вядома, Марына Васілеўская адправілася на МКС 23 сакавіка 2024 года і вярнулася на Зямлю 6 красавіка. За час знаходжання на борце станцыі яна выканала некалькі даследаванняў, правяла сеанс сувязі са студэнтамі БДУ і зрабіла здымкі з космасу.

Марына Васілеўская сказала, што адразу пасля палёту прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін прапаноўваў ёй застацца ў атрадзе касманаўтаў на пастаянную працу, але яна адмовілася. «Я, вядома ж, пайшла за нашым Прэзідэнтам, засталася ў Беларусі. У нас тут ёсць над чым працаваць», — прызналася касманаўт. Разам з тым Марына Васілеўская дадала, што калі адбудзецца выхад у адкрыты космас у праграме наступнага магчымага палёту і камандзірам экіпажа будзе ўраджэнец Беларусі Алег Навіцкі, то — паляцім.

Яна звярнула ўвагу, што ў яе для гэтага ўсё ёсць: і вопыт, і здароўе. «Цяпер я працую ў Беларускім фондзе міру, мы займаемся грамадскай, дабрачыннай, міратворчай дзейнасцю, гуманітарным супрацоўніцтвам. Дапамагаем як дзецям, так і дарослаunion пакаленню», — удакладніла Марына Васілеўская.

Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся, ці ўсведамляе, што космас зрабіў яе сапраўднай зоркай? «Я не лічу сябе зоркай. Заваяваны космас — наша сумесная перамога. А я проста чалавек, які выканаў гэтую місію, — заўважыла Марына Васілеўская. — Мне прыемна, што лёс абраў мяне. Я і цяпер просты, звычайны чалавек, але ўжо з місіяй першага касманаўта суверэннай Беларусі».

**Сяргей КУРКАЧ.**

# КОСМАС НАСТАЎНІКА ЛЕАНІДА КАЧАНАВА

## Дырэктар Слаўгарадскай СШ № 2 пра тое, як кіраваў касмічнымі апаратамі

Леанід Качанаў у сістэме адукацыі не адзін дзесятак гадоў, але космас лічыць для сябе роднай стыхіяй. У 1986-м яму пашчасціла служыць у адной з касмічных воінскіх часцей Савецкага Саюза.



— Армія ёсць армія, там, як і ўсюды, хапае складанасцяў, але пры ўспаміне пра гады службы на сэрцы становіцца цёпла, — прызнаецца настаўнік. — Я лічу, што мне вельмі пашчасціла датыкнуцца да самай перадавой на той час вобласці навукі — асваення космасу.

Воінская часць, дзе праходзіў тэрміновую службу радавы Качанаў, называлася НВП-10 (наземны вымяральны пункт), які забяспечваў кіраванне і палёт касмічных апаратаў. Такіх пунктаў было ў Савецкім Саюзе шмат, як, дарэчы, і саміх касмічных апаратаў. Той, куды трапіў суразмоўнік, знаходзіўся ў Крыме ў раёне пасёлка Школьнае, недалёка ад Сімферопаля. Месца, дзе ў сярэднім 280 сонечных дзён у годзе. Гэты наземны вымяральны пункт быў заснаваны ў 1957 годзе, і тут неаднаразова бывалі вядомыя касманаўты, у тым ліку Юрый Гагарын, канструктар Сяргей Каралёў, а таксама былы генеральны сакратар ЦК КПСС Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў.

— Мне давялося праходзіць там тэрміновую службу з 1986 па 1988 гады, — расказвае Леанід. — Часць была сакрэтная, нават самым блізкім людзям мы не мелі права расказваць пра яе. Для іх у нас існавала легенда, што мы забяспечваем сувязь з далёкай авіяцыяй. І яшчэ на працягу пяці гадоў пасля службы не мелі права расказваць. Калі я трапіў туды, вельмі здзівіўся, што сувязь з космасам забяспечваюць звычайныя салдаты. Асабісты склад быў настолькі падрыхтаваны, што ён самастойна мог правесці любы сеанс сувязі. Абсталяванне, якім карысталіся, лічылася самым перадавым на той час і каштавала велізарных грошай. Складаная тэхніка з мігаючымі святлодыёдамі працавала на двайчым кодзе і ніколі не давала збояў.

Цікавасць да часці з боку іншаземных агентаў была вялікая. Суразмоўнік успамінае нашумелы выпадак, калі нейкі шпіён употай зрабіў здымак аднаго з будынкаў часці, які быў апублікаваны ў замежнай прэсе.

— Павышаная ўвага да нашага НВП зразумелая, — кажа Леанід. — На яго тэрыторыі адбывалася шмат цікавых даследаванняў. Напрыклад, перад запускам на Месяц у нас праходзіў выпрабаванні месяцаход. Тамтэйшы грунт вельмі падобны на той, што на Месяцы.

У арміі Леанід засвоіў тры спецыяльнасці, асноўнай з якіх была аператар праграмнага навядзення антэны станцыі «Рамонак» — найноўшы эксперыментальны тэлеметрычны комплекс МА-9МКТМ-4-3. Малады салдат займаўся вымярэннямі на адлегласці — здабываў інфармацыю аб стане борта. Падбор персаналу быў асаблівым, работа — вельмі сакрэтнай і адказнай. Спатрэбіліся веды па фізіцы і геаграфіі.

— Адкрыццём для мяне стала тое, як шмат на арбіце знаходзіцца апаратаў, — расказвае падрабязнасці суразмоўнік. — У Савецкім Саюзе гэты факт не агучваўся, людзі ведалі, што нешта там запусцілі, але нават не дагадваліся аб маштабах. Адным словам, работы ў нас было шмат, працавалі суткамі...

Памылка пры вымярэнні прыводзіла да страты сігналу і сувязі. І Леанід ганарыцца, што такіх прамашак у яго рабоце не было. Успамінае кур'ёзны выпадак, калі ў 1987 годзе малпы, якіх з нейкай мэтай закінулі на арбіту, адвязаліся і пачалі шкодзіць. Камандаванне дало загад тэрмінова саджаць іх на зямлю.

Леанід удзельнічаў у запусках апаратаў на Венеру і Марс. З нецярпеннем чакаў — і яго таксама да гэтага вельмі сур'ёзна рыхтавалі — запуск шматразовага чоўна «Буран» у аўтаматычным рэжыме палёту і пасадкі. Запуск гэты адбыўся, але пазней. Леанід ужо ў ім не ўдзельнічаў — тэрмін яго службы скончыўся.

На жаль, праект з «Буранам» не атрымаў далейшага развіцця з-за развалу СССР. Вядома, што савецкі аналаг распрацоўваўся ў процівагу амерыканскаму «Шатлу», з дапамогай якога амерыканцы хацелі мець перавагі ў космасе. Савецкі «Буран» атрымаўся больш грунтоўны і манеўраны і пераўзыходзіў амерыканскі касмічны карабель.

Вайсковая часць 14109, яна ж НВП-10 праіснавала да 19 сакавіка 1997 года. Цяпер ад яе застаўся толькі пасёлак, дзе жывуць ветэраны былога касмічнага падраздзялення.

— Аўтарытэт нашых камандзіраў, як і іх дасведчанасць у кіраванні найноўшай апаратурай, былі вельмі высокія, — кажа Леанід. — Яны былі для нас узорам належнай выпраўкі, стойкасці, мелі глыбокія інжынерныя веды. Мы, тэрміновыя служачыя, разумелі, наколькі адказныя і важныя задачы выконваем. Таму самадысцыпліна была жалезная. Мы адказвалі за тых, хто знаходзіцца на арбіце, і наогул за тое, што там адбываецца. Магчыма, нехта, хто меў дачыненне да касмічных войскаў, пачытае гэтыя радкі і адгукнецца. Было б цікава абмяняцца ўспамінамі. Фота таго перыяду, на жаль, не засталося. Іх наогул не дазвалялася рабіць. Але найлепшае фота — гэта наша памяць. Усіх аднапалчан з Днём касманаўтыкі!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Леаніда КАЧАНАВА.**

# СУСВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ДУШЫ І ПРАЦАВІТАСЦІ

Напярэдадні Дня касманаўтыкі ў кінатэатры «Піянер» адбыўся прэм'ерны паказ дакументальнага фільма «Наш космас». Кінастужка выйшла на студыі «Летапіс» нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», яе рэжысёрам-пастаноўшчыкам стаў Дзмітрый ЛОСЬ. Праца прысвечаная ўнёску Беларусі і беларусаў у асваенне касмічнай прасторы.

Фільм кожным эпізодам пацвярджае, што, калі ў чалавека ёсць мэта, то яму скараецца любая вяршыня і вышыня. Ён можа нават даляцець да зор. Тут і зараз на вялікім экране глядач бачыць вядомых касманаўтаў, але ў тое ж імгненне ўсведамляе, які шлях кожны з іх прайшоў, каб пераадолець зямное прыцягненне, каб вярнуцца дадому сапраўдным героем.





Асаблівую цеплыню кінастужцы надаюць малавядомыя шырокаму колу гледачоў «нябесныя» і «зямныя» кадры з удзелам лётчыкаў-касманаўтаў — выхадцаў з Беларусі. Таксама гледачы ўпершыню пачуюць, што сказалі адзін аднаму Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак, калі сустрэліся на арбіце, убачаць, як сустракалі нябесных першапраходцаў на іх малой радзіме, а яшчэ змогуць пранікнуцца яркімі, эмацыянальнымі расповедамі Алега Навіцкага і Марыны Васілеўскай пра іх гераічную «касмічную працу» і пра тое, як выглядае наша Беларусь у космасе.

— Зрабіць фільм мяне натхніў палёт у космас Марыны Васілеўскай, бо гэта была знамянальная падзея для ўсіх нас. Разам з тым не толькі касманаўты, але і вялікая колькасць іншых людзей працуе ў гэтай галіне ў нашай краіне, — падзяліўся рэжысёр кінастужкі Дзмітрый Лось. — Падчас работы над фільмам мы якраз і пазнаёміліся з такімі героямі, а таксама ў працэсе звярталіся да архіўных матэрыялаў. Хранаметраж у нас 26 хвілін, і калі толькі рыхтаваліся да здымак, то некаторыя казалі, быццам немагчыма столькі часу распавядаць пра беларускі космас, маўляў, дзе вы столькі матэрыялу знойдзеце? А цяпер я магу сказаць, што на гэту тэму можна цэлую серыю фільмаў зрабіць, бо вельмі многае робіцца людзьмі і дзяржавай... Для мяне беларускі космас — гэта размова пра беларускую душу, пра нашу працавітасць, цярпенне, міралюбівасць, а не проста лічбы і даты.

Прэм'ерны паказ фільма «Наш космас» па ўсёй краіне стартаваў 10 красавіка, і на працягу некалькіх месяцаў убачыць кінастужку на вялікім экране змогуць усе жадаючыя. А ў перспектыве ў ствральнікаў кінакарціны ёсць жаданне працягнуць аповед пра прафесіяналаў касмічнай галіны.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**





# «КРАНАЛЬНА ДА СЛЁЗ»

**Прадстаўнікі Магілёўскай вобласці падзяліліся ўражаннямі ад канцэрта-рэквіема «Кожны трэці»**

Серыя канцэртаў-рэквіемаў «Кожны трэці», арганізаваная па даручэнні Прэзідэнта для ўсіх рэгіёнаў краіны, працягваецца. У чацвер кранальную праграму ў Палацы Рэспублікі ўбачылі прадстаўнікі Магілёўскай вобласці.





— Мы ўсё яшчэ адкрываем старонкі той страшнай гісторыі — тых злачынстваў, якія адбываліся на беларускай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і менавіта таму важна не толькі гаварыць аб гэтых трагедыях, але і паказваць іх праўду ўсяму свету, — адзначыў перад пачаткам мерапрыемства **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.**

Паводле яго слоў, неабходна перадаць маладому пакаленню ўсведамленне таго, наколькі крохкі мір і як важна яго берагчы.

— Трэба ганарыцца тым, што мы жывём у такой краіне, дзе можам проста спакойна працаваць, адпачываць, выхоўваць дзяцей. І на самай справе гэта дарагога варта. Гледзячы на тое, што адбываецца вакол, яшчэ больш пачынаеш шанаваць гэты мір, — падзяліўся ён.

Таксама кіраўнік рэгіёна дадаў, што пачуццё жалю па загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны закладзена ў беларусаў у генах. Менавіта з гэтай прычыны гледачы канцэрта-рэквіема «Кожны трэці» выходзяць з залы са слязамі на вачах:

— Яны прымаюць гэты боль як свой. Бо няма такой сям'і, якая б не пацярпела ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Кожны трэці загінуў — гэта быў генацыд.

Хутка пачаўся канцэрт. Кожны нумар кранаў гледачоў да глыбіні душы. Выступіў для магілёўчан і іх зямляк, **артыст Духавога аркестра ГУУС Мінгарвыканкама Сяргей КУДРАЧОЎ.** Ён лічыць удзел у канцэрце-рэквіеме «Кожны трэці» вялікім гонарам. Для гледачоў артыст выканаў песню «Не будите уснувших солдат» на словы Ганны Сялук і музыку Валерыя Шмата.

— З гэтай песняй мяне звязвае асаблівае пачуццё, таму што я спяваю яе ад імя свайго дзеда, які загінуў пад Берлінам, не дажыўшы да Перамогі ўсяго толькі тыдзень, — падзяліўся Сяргей Кудрачоў.

Разам з ім на сцэну выходзілі артысты ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусі. Яны таксама выконвалі гэту кампазіцыю ад асобы ўсіх воінаў, якія аддалі свае жыцці за мір.

Верагодна, кожны ў зале падчас канцэрта праводзіў паралелі з гісторыяй сваёй сям'і. Так, у **заслужанага будаўніка, пенсіянеркі з Магілёва Людмілы СЛЕСАРЧУК** бацька прайшоў усю вайну ад Гомельскай вобласці да Вены.

— Такая горыч на душы, што страцілі столькі дзяцей, братоў, бацькоў. Вы ведаеце, я плакала. Такое не павінна паўтарыцца. Людзі ўсіх узростаў павінны сціснуць далоні у кулак і абараніць сваю любімую Беларусь. Гэта для нас самае галоўнае, — падзялілася яна. — Гэты канцэрт літаральна перавярнуў усю маю душу, — прызналася жанчына, — ён вельмі дакументальны і сапраўдны. Менавіта дзякуючы гэтаму тут вельмі моцна адчуваецца датычнасць да гістарычнай памяці.

За вывучэннем экспазіцыі ў холе Палаца Рэспублікі мы засталі і **старшыню Дрыбінскага раённага Савета дэпутатаў, старшыню раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» Святлану ЗАВІДОЎСКУЮ.**

— Мы ўсе звязаныя з гісторыяй і шануем памяць. У нас у кожнага ёсць яшчэ і сямейная памяць, — падзялілася яна. — Таму мы прыехалі сюды, каб аддаць даніну павагі нашым прадзедам, дзядам, якія ваявалі, і, натуральна, такім чынам выказаць падзяку ім за наша мірнае жыццё.

Па словах Святланы Завідоўскай, такія мерапрыемствы вельмі важныя яшчэ і таму, што яны аб'ядноўваюць нас, нашчадкаў тых герояў.

— Гэта вяртае нас да тых часоў, калі нашы дзяды рабілі ўсё разам. Гэта кажа пра тое, што толькі разам мы можам зрабіць добрыя справы для нашай Радзімы. Я лічу, што на дадзены момант гэта аб'ядноўвае і гэта галоўны ідэалагічны складнік, а таксама добрая аснова для нашага будучага пакалення.

На канцэртах Святлана Завідоўская бывае часта. Аднак гэты ўразіў яе да глыбіні душы.

— Вельмі хвалявальна, усе нумары прайшлі на адным дыханні, часам было кранальна да слёз. Усё настолькі добра зроблена, што стрымліваць эмоцыі няпроста. Я вельмі ўдзячная тым, хто арганізоўваў гэта мерапрыемства, і тым, хто выступаў для нас. Бо артысты літаральна жылі на сцэне! — заключыла яна.

Не менш яскравыя ўражанні ад мерапрыемства атрымаў і **настаўнік гісторыі сярэдняй школы №1 г. Кіраўска Іван ХРАМЯНКОЎ.** Паводле яго слоў, канцэрт быў вельмі цяжкі ў эмацыйным плане. Тым не менш, гэта вельмі патрэбная памяць для ўсіх.

— Чым больш будзе нас, такіх, якія памятаюць усё гэта, тым больш немагчымым будзе паўтарэнне таго кашмару, які прыйшлося перажыць нашым продкам, — падзяліўся ён.

Доўгія спісы загінулых, ваенная хроніка, размытыя фатаграфіі людзей, якія перажылі жахі той вайны... Усё гэта пакінула незабыўны след у душы маладога чалавека.

— За кожнага з удзельнікаў тых падзей перажываеш так, як быццам гэта твой сваяк. Мусіць, у гэтым і выяўляецца наша беларускае адзінства. Усё роўна, хто ты, адкуль ты, але ты ўсё роўна наш, і за цябе мы будзем перажываць як за свайго, — сказаў Іван Храмянкоў.

Самым кранальным нумарам для яго стала кампазіцыя, прысвечаная дзецям. Малады чалавек сам нядаўна стаў бацькам, таму гэта тэма для яго вельмі асабістая і актуальная.

Кожны знайшоў сярод канцэртнай праграмы тое, што адгукнулася ў сэрцы. Кожны задумаўся аб подзвігу продкаў і аб каштоўнасцях такога крохкага, але вельмі неабходнага ўсім міру.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

НАША ПАМЯЦЬ

# «НЕ ДАЙ БОГ, КАБ ГЭТА ПАЎТАРЫЛАСЯ»

**У Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў жахі вайны ўспаміналі ў Трасцянцы**

Штогод жалобны дзень 11 красавіка ўспамінаюць ва ўсім свеце. Менавіта ў гэты дзень у 1945 годзе вязні Бухенвальда на чале з інтэрнацыянальным палітычным цэнтрам паднялі ўзброенае паўстанне, у выніку якога захапілі лагер і ўтрымлівалі яго да прыходу саюзных войскаў. Наша краіна памятае страшную трагедыю той жудаснай вайны, і ў гэту пятніцу тысячы мінчан і гасцей сталіцы прыйшлі ў мемарыяльны комплекс «Трасцянец», каб ускласці кветкі і аддаць даніну памяці тым людзям, якія сталі ахвярамі фашызму.



Прыходзячы на гэтыя месцы, мы яшчэ раз аддаём даніну памяці тым людзям, якія бязвінна загінулі, тым людзям, якія змагаліся за тое, каб іх зямля засталася іх зямлёй, каб тут раслі іх дзеці, заявіла **першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ.** «Мы, як унукі і праўнукі, абавязаны захаваць гэту памяць, перадаць яе нашаму маладому пакаленню. Яшчэ раз трэба сказаць вялікі дзякуй усім тым, хто выстаяў, хто выжыў і хто перамог».

Біяграфія кожнага з вязняў фашысцкіх канцлагераў — гэта сапраўдны прыклад стойкасці, мужнасці, бязмежнай прагі жыцця, лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей СІВЕЦ.** «А для нас — тых, хто сёння мае магчымасць жыць пад мірным небам, — гэта маральны ўрок. І наш агульначалавечы, агульнаграмадзянскі абавязак — зрабіць усё магчымае і немагчымае, каб наша шматпакутная зямля ніколі больш не спазнала жахаў вайны», — сказаў ён.

**Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Эдуард СЕВЯРЫН** звярнуў увагу на тое, што ў сучасным палітычным свеце, у тым ліку ў суседніх дзяржавах, адбываецца сціранне, адбельванне тых злачынстваў, якія былі здзейснены ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Мы павінны памятаць, перадаць будучым пакаленням і адстойваць свае пазіцыі на ўсіх узроўнях: на духоўным узроўні, на ўзроўні палітыкі», — адзначыў дэпутат.



Звяртаючыся да прысутных, былы **непаўналетні вязень канцлагера Гановер Інэса КУЛАГА** сказала: «Зрабіце ўсё магчымае, каб ніколі не паўтарыўся наш сумны канцлагерны лёс. Гадуйце дзяцей, вучыцеся, працуйце, абараняйце мірнае неба. Будзьце пільныя, стойкія, моцныя духам, працай і моцай захоўвайце нашу Айчыну, мір і шчасце сваіх дзяцей і дзяцей будучых пакаленняў».

У размове з журналістамі Інэса Кулага падзялілася сваімі асабістымі ўспамінамі аб тым страшным часе: «Я была трохгадовым дзіцем, калі мяне ў 1943 годзе разам з мамай і сястрычкай сагналі ў Германію. Тады нас змясцілі ў таварныя вагоны, мы доўга ехалі.... Наша сям'я трапіла ў канцлагер Гановер, які цалкам быў акружаны калючым дротам... Гэта быў вельмі жудасны час, пастаянны холад, голад... І калі мы бачылі, што каля сметніцы валяюцца нейкія кавалачкі хлеба, мы гатовыя былі з'есці кожную крошачку. Калі бывала і такое, што хтосьці перакіне бульбіну або кавалачак хлеба праз плот, а наглядчык бізуном нас адганяў. Ён псаваў усё нагамі, каб нам нічога не дасталася. Гэта быў вельмі страшны час, і не дай Бог, каб гэта паўтарылася».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР
ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ
67 (7393)
ПЯТНІЦА
13
красавіка 1945 г.
Цана 20 кап.
СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

## • На фронце

На паўночным усходзе ад Вены войскі 2-га Украінскага фронту з баямі прасоўваліся наперад. Немцы ўвялі ў бой яшчэ адну танкавую дывізію, буйныя сілы пяхоты і неаднаразовымі контратакамі спрабавалі не дапусціць выхаду нашых часцей на тылы сваёй венскай групіроўкі. «**Пераадольваючы ўпорнае супраціўленне праціўніка, нашы войскі авалодалі чыгуначнай станцыяй Эйбесбрун і перарэзалі чыгунку і шасейную дарогу Вена — Брно. Такім чынам, у распараджэнні нямецкіх войск, якія дзейнічаюць у раёне Вены, асталася адна чыгунка, што ідзе ўздоўж берага Дуная на паўночны захад. Дарога абстрэльваецца совецкімі артылерыстамі, якія выйшлі на паўднёвы бераг Дуная, на паўночны захад ад аўстрыйскай сталіцы**», — паведамляла Савецкае інфармбюро. Адбіваючы варожыя контратакі, войскі фронту спалілі і падбілі 40 танкаў і самаходных гармат, 18 бронетранспарцёраў праціўніка. Было ўзята ў палон больш за 500 нямецкіх салдат і афіцэраў, а таксама захоплены трафеі, у ліку якіх чатыры самалёты і 250 чыгуначных вагонаў з ваеннымі грузамі.

Войскі 3-га Украінскага фронту працягвалі весці баі па вуліцах Вены. «Совецкія часці яшчэ ў некалькіх месцах пераправіліся праз Дунайскі канал і, адбіваючы контратакі немцаў, крок за крокам прасоўваюцца ўперад. Асабліва жорсткія баі ідуць у раёне паўночна-заходняга вакзала. Штурмавыя атрады, дзейнічаючы сумесна з артылерыстамі, блакіруюць вузлы супраціўлення немцаў і ліквідуюць іх», — паведамляла наша газета. Праціўнік нёс велізарныя страты — за 12 красавіка было знішчана звыш чатырох тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

У баях за вызваленне Вены савецкія войскі праяўлялі высокую воінскую смеласць і адвагу. «**На адной вуліцы нямецкі танк моцным агнём перашкаджаў прасоўванню нашай пяхоты. Гвардыі старшы сяржант Бурлакоў падпоўз да варожага танка і кінуў бутэльку з гаручай сумессю. Танк загарэўся. Нямецкіх танкістаў, якія прабавалі выратавацца бегствам, сержант знішчыў агнём з аўтамата. Аддзяленне сержанта Плаходава атакавала дом, у якім умацаваліся гітлераўцы. Нашы байцы ўварваліся ў дом, знішчылі групу немцаў і ўзялі ў палон 9 салдат праціўніка. Гвардыі чырвонаармеец Валетаў на працягу дня знішчыў 7 нямецкіх салдат і аднаго афіцэра**», — паведамляла «Звязда».

## • У тыле

У Гарадзішчанскім раёне Брэсцкай вобласці заканчвалася вяртанне зямлі беззямельным і малазямельным сялянскім гаспадаркам, якая была адабрана нямецкімі бандытамі. Ва ўсіх вёсках раёна ішлі палявыя работы і сяўба яравых культур. У многіх з іх быў арганізаваны збор насення для тых гаспадарак, што найбольш пацярпелі ад немцаў. «У вёсках створаны звенні дапамогі бясконным гаспадаркам. У першую чаргу дапамога аказваецца сем'ям франтавікоў, партызан і інвалідаў Айчыннай вайны», — паведамляла наша газета.


ВЫШЭЙ ТЭМПЫ І ЯКАСЦЬ СЯЎБЫ!
УПЕРАДЗЕ ТРАКТАРЫСТ КАНСТАНЦІН БУЛАЎКА
ПРАЦУЮЦЬ СКОПАМ, НІЗКАЯКАСНА

У Валнянскім сельсавеце перад пачаткам палявых работ былі праведзены сходы сялян. Працаўнікі абавязваліся, папершае, правесці сяўбу ў сціслыя тэрміны, а таксама дапамагчы бясконным гаспадаркам апрацаваць свае палі. Дэпутат сельсавета, селянін вёскі Бортнікі Платон Шчэрба, выступаючы на сходзе, казаў: «**Ад імені ўсіх сялян вёскі выношу вялікую падзяку совецкай уладзе, Чырвонай Арміі і таварышу Сталіну за вызваленне нас з нямецкай няволі. Мы зноў сталі вольнымі і шчаслівымі, сталі гаспадарамі сваёй зямлі**». Ён асабіста абавязваўся засеяць і вырасціць на сваім полі добры ўраджай, а таксама дапамагчы апрацаваць яравы клін сям'і франтавіка Страмскога.

Селянін Міхаіл Жынкевіч у сваю чаргу абавязаўся дапамагчы Зінаідзе Снежка, муж якой загінуў на фронце. Жанчына была дагэтуль беззямельная. «**Цяпер яна атрымала 2 гектары зямлі, але не мела насення. Валнянскі сельсовет выдаў ёй з сабранага фонду 100 кілаграмаў аўса, 80 кілаграмаў ячменю і 300 кілаграмаў бульбы**», — пісала наша газета.

Партызанская сям'я Зінаіды Сурмы атрымала маёмасць у 3,5 гектара зямлі, сельсавет таксама выдаў 120 кілаграмаў аўса, 90 кілаграмаў ячменю і 300 кілаграмаў бульбы: «У адказ на вялікія клопаты совецкай улады аб нас, сялянах, мы пастараемся вырасціць багаты ўраджай. Сваёй упорнай працай на палях дапаможам нашай роднай Чырвонай Арміі хутчэй знішчыць немца-звера», — адзначала жанчына.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

КАНТЭКСТ

# ТРЫЗНЕННЕ ПАНЬСТВА

## Чаму ў Польшчы абвяргаюць інфармацыю аб правозе больш чым паўтоны ўзрыўчаткі?

Як ужо паведамляла «Звязда», 2 красавіка ў пункце пропуску «Брэст» быў затрыманы мікрааўтобус на малдаўскіх нумарах з 580 кілаграмамі ўзрыўчаткі, які ехаў з Польшчы. Машыну транзітам пераганялі з Літвы ў Расію.

Як адзначыў у эфіры тэлеканала «Першы інфармацыйны» расійскі эксперт, у галіне мінна-падрыўной справы Уладзімір Грубнік, «гэта быў не проста пентаэрытрыттэтранітрат, а ўжо яго пластыфікаваная версія — падрыхтаваная пластыфікаваная ўзрыўчатка. Трэба зразумець, што падобныя мерапрыемствы пластыфікацыі выбуховых рэчываў у такіх колькасцях магчымыя толькі сур'ёзным заводскім спосабам. І падобнымі рэчамі непасрэдна займаюцца ў краінах НАТА. Эквівалент да тратылу 1,3 — ён на 30 % больш эфектыўны за тратыл па сваіх брызантных і фугасных уласцівасцях. Адпаведна 580 кг рэчыва можа быць скарыстана, напрыклад, каб вы разумелі памеры аб'ектаў, пры падрыве вялікага маста, вялікага шматкватэрнага будынка, гандлёвага цэнтра, падрыву дамбы, ці ж скарыстана рэальна ў сотнях розных тэрактах і акцый прамога дзеяння, ліквідацыях».

Ваеннаслужачы спецыяльнага сапёрнага падраздзялення ўнутраных войскаў МУС Беларусі заўважыў у эфіры «Першага інфармацыйнага»: «Можна меркаваць, што неабходна было даставіць гэту вельмі вялікую колькасць рэчыва ў Расійскую Федэрацыю. Далей, падзяліўшы яе на некалькі сотняў тысяч частак, можна было зрабіць вельмі шмат нестандартных самаробных выбуховых прыстасаванняў. Або падрыхтаваць машыну непасрэдна ўжо ў той дзяржаве, дзе яна прызначалася, і здзейсніць тэракт, разбурэнне. Так, разбурэнні былі б вельмі вялікія».

Філігранная прафесійная аперацыя беларускіх мытнікаў, якія папярэдзілі катастрафічную па сваіх маштабах бяду (або нават шмат асобных тэрактаў), ва ўсіх нармальных людзей выклікае толькі адну рэакцыю — павагу. І разуменне таго, што б магло здарыцца, калі б не ўдалося абысці ўсе зламысныя хітрасці арганізатараў выбуховага транзіту. Як вядома, рэчыва спрабавалі схаваць, накрыўшы яго вібрашумаізаляцыйнымі лістамі і лістамі ДСП. Для таго каб на яго не зрэагавалі службовыя сабакі, унутраныя краі кузава апрацавалі тэхнічнай змазкай. Але, дзякуй богу, смяротна небяспечны груз быў знойдзены.

Навіна, вядома, апынулася ў топе інфармацыйных агенцтваў. Польскія ж медыя падзею, якая напрамую іх датычылася, — груз без перашкод прайшоў праз пункт пропуску «Цярэспаль» — паставілі пад сумнеў. У прыватнасці, выданне Wiadomosci нагадала, «што інфармацыя, якая прадстаўляецца беларускімі службамі, можа мець прапагандысцкі характар або з'яўляцца элементам інфармацыйнай вайны з краінамі Захаду». Далей — больш. «Мы не каменціруем матэрыялы, якія публікуюцца службамі Беларусі, разглядаючы іх як элементы дэзынфармацыі», — заявіў афіцыйны прадстаўнік Надбужанскага аддзела пагранічнай службы Дарыюш Сеніцкі. А прэс-сакратар палаты падатковай адміністрацыі ў Любліне Міхал Дзярусь і ўвогуле абверг падзею, якая, да слова, адбывалася літаральна ў прамым эфіры — пад шматлікімі відэакамерамі: «Нацыянальная падатковая адміністрацыя Польшчы не пацвярджае інцыдэнт з вывазам з Польшчы ў Беларусь 580 кг выбуховых рэчываў. Паведамленне беларускай мытнай службы — частка прапагандысцкіх намаганняў рэжыму. Нацыянальная падатковая адміністрацыя прымае ўсе неабходныя меры па забеспячэнні бяспекі і эфектыўнага кантролю на граніцы».

Ну нічога сабе «эфектыўны кантроль» і «забеспячэнне бяспекі»...



А ведаеце, усё гэта вельмі нагадвае сімптомы цяжкага псіхічнага захворвання, сярод якіх ёсць і перабольшванне сваіх магчымасцяў і дасягненняў, і беспадстаўныя асцярогі нападзення, пошук ворагаў, і пастаянны страх, а таксама адмова прызнаць відавочнае (як вядома, вясной хвароба абвастраецца). Менавіта такімі выглядаюць цяперашнія бязглуздыя дзеянні польскіх афіцыйных асоб і прадстаўнікоў медыя — трызненне паньства, не інакш. Чарговая кампанія, якая зноў накіраваная на тое, каб «на калене» зляпіць фэйк і (з дапамогай нашых збеглых, куды ж без іх) імкнуцца «скарміць» яго аўдыторыі. Але ж нават непрафесіяналу ў медыясферы бачна, што ўсё гэта «шытае белымі ніткамі».

А сляды вядома куды вядуць. «Польскія спецслужбы актыўна супрацоўнічаюць з украінскімі, таму варыянт іх сумеснай тэрарыстычнай аперацыі не выключаны, — заўважыў БелТА польскі экс-суддзя Томаш Шміт, якому добра вядомы «адваротны бок» афіцыйнай Варшавы. — Відавочна, тое, што адбылося, выклікала паніку ў некаторых польскіх колах, асабліва ў тых, якія звязаныя з аперацыямі разведкі і контрразведкі. Развал усёй аперацыі адбыўся дзякуючы бездакорнай рабоце беларускіх пагранічных службаў».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Лидская обувная фабрика»**

**Аукцион состоится 15.05.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ № 1 Капитальное строение с инвентарным номером 420/С-34179 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных, меховых и (или) кожаных изделий, наименование – здание корпуса цеха № 10), с составными частями и принадлежностями.<br>ЛОТ № 1 расположен на земельном участке площадью 0,1819 га, с кадастровым номером 423650100007000809, по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. 8 Марта, 24В.<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 В; охранная зона систем газоснабжения. Часть земельного участка. Ограничения согласно положению о порядке установления охранных зон объектов газораспределительной системы, размерах и режиме их использования, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь 06.11.2007 № 1474, площадь 0,0851 га |
| **Условия аукциона** | - возмещение победителем аукциона затрат, понесенных продавцом в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» на проведение независимой оценки капитального строения в размере 666,08 белорусских рублей (шестьсот шестьдесят шесть рублей восемь копеек);<br>- возмещение победителем аукциона затрат, понесенных продавцом в Лидский филиал РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации» за составление выписок из ЕГР недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, о правах, ограничениях (обременениях) прав на объект недвижимого имущества в размере 30,28 белорусских рублей (тридцать рублей двадцать восемь копеек);<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведения аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта |
| **Начальная цена продажи** | 476 400,00 руб. (четыреста семьдесят шесть тысяч четыреста рублей) с учетом НДС по ставке 20 % |
| **Сумма задатка** | 47 640 руб. (сорок семь тысяч шестьсот сорок рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 13.05.2025 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/


ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ

# АГОНЬ ПАМЫЛАК НЕ ДАРУЕ

## У краіне расце колькасць пажараў, на якіх гінуць людзі

З пачатку года ў Беларусі адбылося 2179 пажараў, і гэта на 37 % надзвычайных выпадкаў больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Статыстыка сведчыць і аб негатыўнай тэндэнцыі росту загінулых на пажарах. Па стане на 10 красавіка, ахвярамі агню сталі 230 чалавек, у тым ліку дзіця (трагедыя адбылася ў Лунінецкім раёне).





Большасць узгаранняў (а гэта без малога 80 % ад агульнай колькасці) прыпадае на жыллёвы фонд. Асноўнай прычынай няшчасных выпадкаў з трагічным фіналам па-ранейшаму застаецца неасцярожнае абыходжанне з агнём. Пры гэтым з 796 пажараў 407 адбыліся з-за непатушанай цыгарэты: згубная звычка забрала жыцці больш як 139 чалавек. Многія з іх на момант узгарання знаходзіліся ў алкагольным ап'яненні.

Прычынай крыху больш як паўтысячы пажараў стала парушэнне правілаў устройства і эксплуатацыі печаў, цеплагенерацыйных агрэгатаў і прылад. З-за невыканання правілаў устройства і эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання адбылося 548 пажараў. За кожным такім выпадкам — калі не паламаны лёс, дык страчаная або пашкоджаная маёмасць, парушэнне звычайнага ўкладу жыцця, маральная спустошанасць.

### ЦАНА ШКОДНАЙ ЗВЫЧКІ

Мінімум тры чалавекі маглі загінуць на пажары ў адным са шматпавярховікаў у Лідзе. Аб тым, што ў суседнім пад'ездзе гарыць кватэра, ратавальнікам паведаміў жыхар дома. Прыбыўшы да месца выкліку, работнікі МНС устанавілі, што ідзе дым з балкона на пятым паверсе сяміпавярховага шматкватэрнага жылога дома. Высветлілася, што ў кватэры пражывае 55-гадовая жанчына. Напярэдадні здарэння суседзі бачылі яе ў кампаніі двух знаёмых.

Менавіта трох чалавек у стане беспрытомнасці ратавальнікі вынеслі з ахопленай агнём кватэры. У цяжкім стане брыгада хуткай медыцынскай дапамогі шпіталізавала мужчыну і дзвюх жанчын. Эвакуацыя спатрэбілася шасцярым жыхарам суседніх кватэр, сярод якіх было дзіця. Пасля праветрывання яны змаглі вярнуцца ў свае кватэры. Як высветлілі спецыялісты, да надзвычайнага здарэння прывяло неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.

Ратавальнікі настойліва рэкамендуюць не курыць у пасцелі, тым больш у стане алкагольнага ап'янення. Ад непатушанай цыгарэты можа загарэцца адзенне або мэбля. Нават патушаныя цыгарэты нельга выкідваць у вядро з паперамі, іншымі гаручымі адыходамі, а таксама з вокнаў ці балконаў. Для гэтых мэт падыдзе ёмістасць з негаручага матэрыялу, лепш за ўсё напоўненая вадой.

Другі дзень нараджэння можа святкаваць і жыхар Навагрудскага раёна. Пакуль мужчына спаў, па яго адрасе накіроўваліся чатыры пажарныя разлікі. І ўсё дзякуючы відавочцы здарэння, якая своечасова патэлефанавала ў МНС. Яшчэ адзін неабыякавы мясцовы жыхар да прыбыцця ратавальнікаў увайшоў у кватэру праз незачыненыя дзверы. Менавіта ён разбудзіў 52-гадовага гаспадара і вывеў яго на вуліцу. У лічаныя хвіліны ратавальнікі ліквідавалі пажар. Агнём знішчана канапа і маёмасць, закураны сцены і столь у жылым пакоі. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, якая прыбыла на месца, агледзела выратаванага і шпіталізавала яго ва ўстанову аховы здароўя для назірання. І ў гэтым выпадку прычынай пажару стала неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.

### ПЕЧ ПАТРАБУЕ КЛОПАТУ

Пажар у вёсцы Вуглата Асіповіцкага раёна забраў жыцці двух пенсіянераў. Позна вечарам суседзі паведамілі ратавальнікам аб моцным гарэнні будынка. Па прыбыцці падраздзяленняў МНС на месца здарэння агонь ахапіў дом адкрытым полымем. Мясцовыя жыхары выказалі меркаванне, што ў доме могуць знаходзіцца два чалавекі — пажылыя бацькі гаспадара домаўладання. На жаль, іх здагадкі пацвердзіліся. Ратавальнікі знайшлі целы мужчыны і жанчыны 1934 года нараджэння пад канструкцыямі дома, якія абваліліся.

Згодна з папярэдняй версіяй, пажар здарыўся па прычыне парушэння правіл эксплуатацыі печаў, цеплагенерацыйных агрэгатаў і прылад (у коміне печы ратавальнікі выявілі расколіну), парушэння правіл устройства і эксплуатацыі электрасетак.

**МНС Беларусі заклікае грамадзян выконваць правілы пажарнай бяспекі, асабліва ў дачыненні да эксплуатацыі печаў і электрасетак. Варта паклапаціцца аб пажарнай бяспецы ў дамах сваіх састарэлых сваякоў, не пакідаць па-за ўвагай любыя прыкметы небяспекі.**



Па прычыне заўчаснага закрыцця засаўкі коміна трагедыя магла здарыцца і ў Бялынічах. Раніцай гаспадар дома тапіў у печы. На працягу дня чацвёра дзяўчынак (дзве з іх знаходзіліся ў гасцях) пачалі адчуваць недамаганне. Бацькі неадкладна звярнуліся па медыцынскую дапамогу, пасля чаго дзеці былі дастаўлены ва ўстанову аховы здароўя. Іх шпіталізавалі з дыягназам «атручэнне ўгарным газам сярэдняй ступені цяжкасці». Папярэднія даныя ўказваюць на тое, што гэта адбылося з-за заўчаснага закрыцця засаўкі коміна, што прывяло да назапашвання ўгарнага газу ў памяшканні.

Ратавальнікі нагадваюць аб неабходнасці захавання правілаў бяспекі пры выкарыстанні пячнога ацяплення. Каб пазбегнуць трагедый, важна рэгулярна правяраць спраўнасць комінаў і вентыляцыйных сістэм, а таксама не пакідаць печы без нагляду. У выпадку з'яўлення сімптомаў атручвання ўгарным газам (такіх як галаўны боль, галавакружэнне, млоснасць ці слабасць) неадкладна пакіньце памяшканне і звярніцеся па медыцынскую дапамогу.

### У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

У перыяд з 22 да 30 сакавіка ў краіне прайшла традыцыйная рэспубліканская пажарна-прафілактычная акцыя МНС па папярэджанні пажараў і гібелі людзей ад іх «За бяспеку разам», якая аб'яднала намаганні розных арганізацый і ведамстваў, якія зацікаўлены ў стварэнні бяспечных умоў пражывання грамадзян у жыллі.

У прафілактычных мерапрыемствах бралі ўдзел прадстаўнікі органаў унутраных спраў, працы і сацыяльнай абароны, адукацыі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аховы здароўя і энергетыкі, СМІ, што дало магчымасць забяспечыць комплексны падыход да выяўлення і ліквідацыі фактараў, якія ўплываюць на бяспеку жыццядзейнасці грамадзян.

— Асноўная задача ўсіх суб'ектаў прафілактыкі — максімальна аб'яднаць намаганні, накіраваныя на недапушчэнне пажараў у жылым фондзе, — адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — У рамках гэтай работы акцэнт робіцца на ўразлівай катэгорыі грамадзян.

Мы бачым партрэт тых людзей, якія гінуць на пажарах. Адпаведна, прымаем неабходныя захады ўжо больш адрасна.

Па-першае, размова ідзе аб пажылых грамадзянах, якія пражываюць самастойна, адзінокіх састарэлых. Па-другое, гэта шматдзетныя сем'і. Па-трэцяе, дзеці, якія выхоўваюцца ў сем'ях, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. На асаблівым кантролі — людзі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Менавіта яны ўяўляюць пэўную небяспеку не толькі для сябе, але і для тых людзей, якія пражываюць побач.

Яўген Бараноўскі праінфармаваў, што кожны грамадзянін можа звярнуцца ў раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях па бясплатную поўнамаштабную кансультацыю па пытаннях павышэння ўзроўню пажарнай бяспекі ва ўласным жыллі.

«Наш інспектар на бязвыплатнай аснове выедзе па ўказаным адрасе і правядзе поўную інспекцыю па пытанні пажарнай бяспекі, — патлумачыў афіцыйны прадстаўнік МНС. — Такую паслугу любы чалавек можа замовіць і для сваіх пажылых бацькоў. Калі раптам будуць выяўлены недахопы, ніякія меры адміністрацыйнага ўздзеяння прымяняцца не будуць. Ратавальнікі дадуць толькі рэкамендацыі, якія датычацца бяспечных умоў пражывання».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы МНС.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Энтер», 220070, г. Минск, ул. Щербакова, 34-23 |
